ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ

Выпуск №7 (83) (ліпень)

www.lit-bel.org www. novychas. info

Культурна-асветніцкі праект Грамадскага аб’яднання «Саюз беларускіх пісьменнікаў» і «Новага часу»

Анонс

ПОГЛЯД

ПІСЬМЕННІКІ ВА ЎЛАСНЫМ СОКУ

Сяргей АСТРАЎЦОЎ

Не за гарамі пяцьсот гадоў нашаму кнігадруку. Начальства нават прапанавала загадзя зрабіць Мінск сталіцай міжнароднага года кнігі ў 2017-м.

Калі Скарыну была важная проста Біблія друкаванымі літарамі — усё о’кей. Калі не менш важным было рабіць беларускія кнігі, то тут толькі нагода пусціць пыл у вочы, разрэкламаваць дасягненні нашага шваца-жняца-дудара. Як у выпадку з тым хакейным чэмпіянатам пахваліцца лядовымі палацамі.

Не, кнігі на мове Купалы і Коласа ёсць, але іх месца ў жыцці краіны — маргінальнае, нікчэмнае. Улада пільна стаіць на варце: каб у іх было чым меней чытачоў. Беларускія школы змянілі хуценька шыльды, беларускай мове нашылі на світку жоўтую зорку. Патрулі строга сочаць, каб нават вочы мінакоў не абражалі шыльды з «няправільнымі літарамі».

Пісьменнікі таксама на ўзбочы. Станоўчае бадай толькі тое, што вярнуліся з савецкіх алімпаў і парнасаў на зямлю. Бо «вышаўшы з хат» некалі, адчулі сябе пад партыйным крылом вучцелямі, вешчунамі і прарокамі. І толькі дзякуючы таму, што здолелі ўладкавацца пры партыйнай «цыцы». Вядома: пісалі толькі так і толькі тое, што надрукуюць, за што атрымаеш ганарар. Жаданне людскае, жыццёвае, але — па-залітаратурнае. Сёння рамкі дазволенага пашыраныя, але падабенства з ранейшымі часамі не знікла. Калі ёсць вернападданы атрад паэтаў і празаікаў, значыцца і аб’ект вернападданых пачуццяў ці памкненняў на месцы. Ён жа заказчык. Раней гэта была дзяржава ў асобе партыі, цяпер улада ў адзіным ліку, з канкрэтным анфасам на сцяне.

Што датычыць пісьменнікаў астатніх, яны апынуліся за сваім сталом у становішчы ў поўным сэнсе стэрыльным. Ніякіх амаль думак, што не датычаць уласна літаратуры. Не таму што не хочацца, проста марныя. Мы пішам, не разлічваючы ні на што. Ніякіх мэтаў, апроч менавіта творчых. Максімальная мара — што нехта цябе надрукуе, не патрабуючы з цябе грошай. Што зможаш патрымаць у руках уласную «бясплатную» для цябе кніжку. Больш разлічваць няма на што. Няма чытачоў. Мы пішам, каб выказаць сябе. Не ў разліку на ананімнага чытача.

Але чытач патрэбны кнізе. Узяць яго няма дзе. Улада падбала, каб яны не пладзіліся. Тых, хто піша па-беларуску, усё больш, і кніг — новых і цікавых. Але каму іх чытаць?

Аднойчы прыяжджаў у Гародню Артур Клінаў са сваім раманам. Ён зыходзіў увогуле са слушнай, але, на жаль, даволі ўтапічнай, пасылкі: патэнцыйна ў беларускай кнігі можа быць нават сто тысячаў чытачоў, толькі трэба самім пісьменнікам пастарацца, каб іхнія рукі пацягнуліся да нашых твораў. Пісьменнік піша, рэкрутаваць ахвотных пад бел-чырвона-белыя «моўныя сцягі» — не яго роля, ён толькі спрыяе.

Нядаўна змог вярнуцца Валер Булгакаў, часовыя ўцёкі закончыліся. Чытаў яго горкія прызнанні: за мяжой няма раю для беларускіх выдаўцоў. Чытачы на бацькаўшчыне, і гэтых чытачоў — тысяча, максімум паўтары... Вельмі цвярозая, выпакутаваная ацэнка Булгакава, не паспрачаешся. У Польшчы каля сарака мільёнаў жыхароў і ўсе чытаюць па-польску, хоць не ўсім патрэбныя кнігі. У Беларусі з тых, каму патрэбныя кнігі, чытачоў на беларускай сапраўды вобмаль. Сто тысячаў Клінава — усё роўна што гарады на Юпітэры Драздовіча. Прывабныя міражы.

Чытачы на бацькаўшчыне, і гэтых чытачоў — тысяча, максімум паўтары. Ах, тысяча чытачоў! З іх бадай палова тых, хто сам піша. Але ж ім самім, кнізе патрэбны чытач у чыстым выглядзе. Калісьці Анатоль Сідарэвіч выгукнуў на адрас Саюза пісьменнікаў БССР: ды яны не чытаюць нават сваіх «братоў па пяры»! Па форме можа й справядліва, але не па сутнасці. Гэта былі пісьменнікі ва ўласным, але разам — у агульным соку. Яны не бывалі за мяжой, не мелі ўражанняў, адрозных ад аднолькавых з суседам.

Мне не было ў іх чаму навучыцца. Мала што маглі даць такія творы, апроч некаторых. У выпадку, калі змушалі сябе менш думаць пра галоўнае божышча СП — цэнзуру. Кніжкі атрымліваліся цікавейшыя. Я любіў малатыражны часопіс рэцэнзій і анатацый замежнай літаратуры. Напрыклад, адзін партугальскі аўтар выпусціў зборнік «канцэнтратаў раманаў», у міні-апавяданні на старонку быў закладзены змест, які нібыта можна было разгарнуць у вялікі твор. На сацрэалістычнай кухні стравы заставаліся стандартнымі...

КПСС з дзяржзаказам «літаратурна-мастацкай прадукцыі» засталася пад вокладкай «Гісторыі СССР», цяперашняму «генсеку» атрад пісьменнікаў патрэбны хіба ў дастаткова дэкарацыйных мэтах. Рынку беларускай кнігі не існавала тады, не ўзнікла й цяпер: у 1995-м начальства рашуча закасала рукавы, сваю справу ведае, «не зра шчы хлябала»! Ёсць адно рынак пісьменнікаў. Кожны ва ўласным соку, не падобным да колішняга «агульнага». Але беларускі моўны соўс па-ранейшаму не ў модзе.

Нават БДУ не выпускае чытачоў беларускай кнігі. А калісьці, даўно, так было. Універсітэту — восемдзесят. З нагоды паставілі помнік студэнту, нечакана — з тварам Скарыны! Рыхтык «чужы сярод сваіх». Надрукаваў для беларускага чытача літаратуру яшчэ сціплым накладам, але з думкай пра будучых тысячы прагных да кнігі. Паўтысячы гадоў мінула, а чытачоў больш не стала. Кнігу замяніў «яшчык», які любіць часам груба паўшчуваць і паздзекавацца таксама любіць з тых, хто галаву дурыць няправільнымі літарамі.

Пяцьсот гадоў мінула, а ім хоць кол на галаве чашы!

svaboda.org

ПАЛІЦА

ЧАС КНІГІ

Выданні серыі Саюза беларускіх пісьменнікаў «Кнігарня пісьменніка» і «Пункт адліку» даступныя чытачам у розных гарадах Беларусі.

Цікаўцеся новымі выданнямі нацыянальнай літаратуры, творамі сучасных беларускіх аўтараў.

У Берасці:
кнігарня «Іскра», вул. Пушкінская, 4;

у Магілёве:
кнігарня «Думка», пр-т Міра, 10;

у Віцебску:
кнігарня «Веды», вул. Леніна, 54;
кнігарня «Светач», вул. Кірава, 10;

у Гародні:
выдавецтва «ЮрСаПрынт», вул. К. Маркса, 11 (уваход праз арку);

у Бабруйску:
кнігарня «Букініст», вул. Ульянаўская, 49;

у Маладзечне:
кнігарня «Спадчына», вул. Прытыцкага, 7;

у Полацку:
кнігарня «Полацк-Светач», вул. Камуністычная, 27;

у Мінску:
«Акадэмкніга», праспект Незалежнасці, 72;
«Кнігарня Ў», праспект Незалежнасці, 37А;
«Кніжны салон», вул. Калініна, 5;
«Кнігарня пісьменніка», вул. Казлова, 2;
«Веды», вул. К. Маркса, 36;
«Светач», пр-т Пераможцаў, 11;
«Цэнтральны кніжны», пр-т Незалежнасці, 19;
«Кнігі & кніжачкі», пр-т Незалежнасці, 14.

ПАЛІЦА

«КАЛЯРОВЫ РОВАР»

Дзіцячая кніга з малюнкамі «Снежны чалавек» Эвы Сусы ў перакладзе са шведскай Алесі Башарымавай пабачыла свет у выдавецтве «Юніпак». Гэта – першае выданне серыі «Каляровы ровар» «Кнігарні пісьменніка» – бібліятэкі Саюза беларускіх пісьменнікаў.

Простая і мілая гісторыя сяброўства двух братоў Уна і Макса са снежным чалавекам аздоблена мастаком Бэнджамэнам Шо. Кніга мае вялікі фармат і добрую паліграфію.

Каб знайсці ўдалую назву для серыі, яе заснавальнікі звярнуліся па дапамогу падпісчыкаў старонак СБП у сацыяльных сетках. Назву «Каляровы ровар» прапанавала перакладчыца Паліна Маслянкова. У падзяку яна атрымае адзін з асобнікаў новай кнігі.

Стваральнікі серыі «Каляровы ровар» спадзяюцца, што яе змогуць папоўніць творы ўдзельнікаў літаратурнага конкурсу «Экслібрыс» імя Янкі Маўра, працы на які прымаюцца да 1 жніўня.

Прэсавая служба СБП

«ЗАЛАТАЯ ЯБЛЫНЬКА»

Учытанцы для дзяцей «Залатая яблынька» сабраныя народныя казкі, легенды і паданні, а таксама творы беларускіх пісьменнікаў.

Фальклорныя пярліны пераказалі Якуб Колас, Алесь Якімовіч, Крыстына Лялько, Уладзімір Сіўчыкаў і Уладзімір Ягоўдзік, а сярод арыгінальных твораў – тэксты Яна Баршчэўскага, Янкі Купалы, Максіма Танка, Станіслава Шушкевіча, Пятра Васючэнкі, Клаўдзіі Каліны.

Адрасуецца кніжка дзецям малодшага і сярэдняга школьнага ўзросту, іх бацькам, бабулям і дзядулям, а таксама настаўнікам і выхавацелям.

Чытачоў найперш павінны зацікавіць такія легенды, як «Адкуль пайшлі беларусы», «Страцім-лебедзь», «Палешукі і палевікі», паданні «Возера Нарач», «Пра Нёман і Лошу», «Бярэсце», «Жодзіна», «Адкуль назва Івянец», «Браслаў», «Чорная дама», «Пане Каханку», «Бяздоннае багацце» і іншыя.

Укладальнікам тома выступіў пісьменнік Уладзімір Сіўчыкаў, а аздобіла яго сваімі малюнкамі мастачка Алена Карповіч.

Алеся Сіўчыкава

«МАКУЛАТУРА-4 — ДЗЁННІКІ ПА АНГЛІІ»

У кнігарні «Логвінаў», дзе шмат гадоў таму, як вядома, прымалі шклатару, зусім нядаўна прымалі «макулатуру». Часопіс «Макулатура-4 — Дзённікі па Англіі» прэзентавалі стваральнікі і аўтары праекта.

«Чаму Англія?» — задаецца пытаннем у прадмове да часопіса рэдактар Сяргей Календа. «Таму што такую рэч беларусам проста грэх абмінаць. Тут вам і клубніцы, і Tower of London, і чырвоныя тэлефонныя будкі. Пякучае жаданне пабачыць горад, які стаў амаль родным, блізкім праз школьныя ўрокі (London is a capital of Great Britain…), дзе амаль усе мы добра ці неахайна вучылі англійскую мову, вершыкі, песенькі».

«Над нумарам працавала дзесяць мастакоў, — расказала дызайнер Васіліса Паляніна-Календа. — Мне здаецца, што для беларусаў Англія — як глыток свабоды. Таму на вокладцы я намалявала дзяўчыну, якая п'е ваду, і ў гэтай вадзе адлюстроўваецца неба. А неба для нас — сімвал свабоды».

«Ангельскі» нумар выйшаў пры падтрымцы Брытанскай амбасады, і на імпрэзе прысутнічаў сам амбасадар Брус Бакнэл.

Адкрыў прэзентацыю Адам Глобус: у нумары надрукаваныя ягоныя творы «пра найлепшага таварыша Сцёпу». «Ведаеце, — зазначыў аўтар, — уся літаратура будуецца на кранальным моманце: памірае і ўваскрасае. Альбо не ўваскрасае. І ў «Парадным партрэце», які ўвайшоў у «Макулатуру», Сцёпа паўстае не ўваскрэслым і не памерлым».

У чацвёртай «Макулатуры» можна прачытаць эсэ «Герберт Уэлс, заслужаны настаўнік БССР» Альгерда Бахарэвіча і «Рок-н-рол» Іллі Сіна.

«Мой выступ звычайна мае тэхнічны характар, — звярнуўся да публікі Ілля Сін. — Трэба, каб у зале засталіся самыя адданыя аматары літаратуры. Таму зараз мы пакрычым, папішчым. Гэта будзе фрагмент тэксту…».

Віктар Марціновіч зачытаў урывак з беларускамоўнага апавядання «Дом». «Хай гэта будзе маім адказам на пытанне, на якой мове я буду пісаць пасля рамана «Сфагнум», — патлумачыў аўтар. — «Дом» — апавяданне пра немагчымасць чалавечага паразумення. Пра праблему сцэнаў, якія стаяць паміж блізкімі людзьмі. Часам гэтыя сцены зробленыя з кардону, а часам — з цэглы».

Да чацвёртага нумара «Макулатуры» таксама спрычыніліся Уладзімір Арлоў (аповеды пра падарожжы ў Лондан у тры розныя гады), Дар'я Вашкевіч (вучылася ў Варвіку, надрукавала ў «Макулатуры» свае занатоўкі), Уладзімір Казлоў (дзённік), Вольга Гапеева (эсэ) ды іншыя літаратары.

Кася Кірпацік

САЮЗ

На чарговым паседжанні Магілёўскага аддзялення ГА «Саюз беларускіх пісьменнікаў» старшыня Мікола Яцкоў зрабіў справаздачу аб зробленым і адзначыў, што асноўнай працай была падрыхтоўка да друку літаратурнага альманаха.

Старшыня рэдакцыйнай камісіі Яраслаў Клімуць расказаў аб тым, як ідзе праца над альманахам і што патрэбна зрабіць у бліжэйшы час. Сваімі меркаваннямі падзяліліся сябры камісіі Міхась Булавацкі і Мікола Яцкоў.

Прысутным была прадстаўлена новая кніга паэзіі Тамары Аўсяннікавай «Стромкая галінка», прагучалі некаторыя вершы, змешчаныя там.

ФЕСТЫВАЛЬ

«ВЯЛІКАЕ КНЯСТВА ПАЭЗІІ» Ў МІНСКУ

Пакуль адкрыццё «Славянскага базару» гучна яднала брацкія народы, у галерэі «Ў» паэты сціпла адстойвалі межы свайго ўласнага княства.



Чарговы раз у Мінску прайшоў міжнародны фестываль Magnus Ducatus Poesis — «Вялікае Княства Паэзіі», на якім беларускія і літоўскія вершы гучалі ў выкананні аўтараў і перакладчыкаў.

Вандроўны фестываль, які з розным размахам праходзіць ажно з 2006 года і прадугледжвае чытанні на мовах дзяржаваў-спадкаемцаў ВКЛ, сёлета абмежаваўся сустрэчай толькі з літоўскімі паэтамі.

На пачатку імпрэзы госці прахаджваліся ў галерэйнай прасторы сярод чорна-белых фотаздымкаў беларускіх замкаў, сядзібаў ды храмаў, зробленых Альгімантасам Александравічусам.

Першым выступіў паэт, перакладчык і вядомы ў Літве фатограф Уладас Бразюнас. Як удакладніў вядоўца Андрэй Хадановіч, большасць перакладаў паэзіі з беларускай, якія з'яўляюцца ў Літве, зробленыя ім.

Паэтка Галіна Дубянецкая выступіла са сваімі купальскімі вершамі. Гук у залі ніяк не мог наладзіцца, таму выступы пераратваліся ў спалучэнне шуму — да словаў паэтаў дамешвалася рэха ў калонках, шчоўканне фотаапаратаў, звон келіхаў, шэпт гледачоў, дзіцячы смех і трывожная няўстойлівая дуда Тодара Кашкурэвіча. Часам словы зусім цяжка было разабраць, яны пераратваліся ў суцэльны звон, тады можна было ўспрымаць іх як медытатыўныя спевы.

Троху яснасці ўнёс голас Алеся Разанава. Ён прачытаў свае пераклады вядомага літоўскага паэта і перформера, аўтара песняў і дзясяткаў кніг, старшыні Саюза літоўскіх пісьменнікаў Антанаса А. Ёнінаса. Разанаў — адзін з нешматлікіх, хто перакладае літоўскую паэзію з арыгінала. Ён расказаў, што некалі на паўгода з'ехаў жыць у Літву і вывучаў там мову ды літаратуру. Сярод выступу Разанаў загаварыў палітоўску, пасля чаго замежныя госці, якія сядзелі ў зале, ухвальна заўсміхаліся і закрычалі «Брава!».

Паэтка і перакладчыца са шведскай Алеся Башарымава прачытала некалькі сваіх вершаў, у тым ліку і верш пра Беларусь, якая «багнай — плясь, лясамі — хрусь». Яго тут жа па-літоўску падхапіў Уладас Бразюнас.

Амбасадар Літоўскай Рэспублікі ў Беларусі Эвалдас Ігнатавічус таксама выявіўся паэтам. Ён звярнуўся да прысутных па-беларуску. Вершы амбасадара па-беларуску прачытала перакладчыца Юлія Цімафеева.

Як заўжды, па-дзіцячы імпульсіўна выступіла Вера Бурлак з творам пра шыбенікаў, які таксама прагучаў і ў перакладзе. Яна прачытала яшчэ некалькі твораў пра паветра, палёт і неба — і, здавалася, сама зараз узляціць некуды пад столь. Андрэй Адамовіч абмяняўся перакладамі з паэтам Марыёсам Буракасам, які спецыялізуецца на перастварэнні Букоўскі. Скончыўся выступ Андрэя Адамовіча выкрыкамі «кашмар!» ад уражанай глядачкі.

Эўгеніус Алішанка, паэт і перакладчык, выдавец часопіса «Вільнюс», які прапагандуе літоўскую літаратуру ў свеце, прачытаў верш пра жанры літоўскай паэзіі, а таксама пра месца, дзе жывуць самыя прыгожыя жанчыны. Андрэй Хадановіч тут жа адстаяў права беларусак на гэтае званне, а пры канцы прачытаў свой сатырычны верш пра стэрэатыпнага беларускага мужчыну. «А ці пазнаеце вы ў гэтым апісанні літоўскіх мужчынаў?» — вырашыў параўнаць менталітэты Хадановіч. «Не пазнаём», — сказаў літоўскі амбасадар, які адзіны з замежнікаў зразумеў пытанне па-беларуску.

Аляксандра Дорская, budzma.org

ЖНІВЕНЬСКІЯ ЮБІЛЯРЫ

У наступным месяцы адзначаюць юбілеі сябры Саюза беларускіх пісьменнікаў:

07.08.1973 – Зміцер Юр'евіч Вішнёў
09.08.1938 – Ала (Альбіна) Іванаўна Сямёнава
15.08.1938 – Валерый Канстанцінавіч Небышынец
23.08.1973 – Аксана Вадзімаўна Спрынчан
25.08.1953 – Уладзімір Аляксеевіч Арлоў
28.08.1963 – Людміла Леанідаўна Барадзейка (Сташка Грыніч)
29.08.1923 – Уладзімір Міхайлавіч Казбярук
30.08.1973 – Наталля Васільеўна Дзянісава
30.08.1928 – Ірына Уладзіміраўна Клімашэўская

Жадаем усім радасці, натхнення і дабрабыту!

ЮБІЛЕЙ

ДЗЯКУЙ ЗА ПЕСНЮ

ДА 100-ГОДДЗЯ ПІСЬМЕННІКА АЛЯКСАНДРА АВЕЧКІНА

Роўна паўвека таму Уладзімір Андрэевіч Калеснік назваў берасцейскага рускамоўнага пісьменніка Аляксандра Авечкіна «чалавекам рамантычных прафесій». У 2014-м спаўняецца 20 гадоў, як пакінуў нас Калеснік, мінула амаль 30, як няма Авечкіна, а сёлета ў лёсавырашальны наш чорны дзень 22 чэрвеня яму было б 100.

Аляксандр Авечкін з памежнікамі

На жаль, мае асабістыя стасункі скласліся так, што шмат каму з адораных Божай іскаркай старэйшых сваіх паплечнікаў не паспеў зірнуць сумленна ў вочы і шчыра падзякаваць за шчырае слугаванне слову, літаратуры. Адным з іх быў і Авечкін, найстарэйшы, найболей вядомы (і не толькі ў Беларусі) празаік.

Іх, сівавалосых і яшчэ густачубых "аксакалаў", што са зброяй у руках прайшлі праз вайну, было шмат у нашай гаманкой сям'і (Засім, Калеснік, Стэльмашук, Ласковіч, дзядзя Федзя Ляўчук, палкоўнік Затульскі, начальнік вайсковых майстэрняў на той час, архітэктар Сурскі, адданы сын Украіны Мыкола Тэлычко, масквіч родам Дзмітры Васільеў). І мы, падшыванцы вайны, гарнуліся да іх — франтавікоў, партызанаў, падпольшчыкаў, а яны да нас, прыпухлагубых студэнтаў і нават яшчэ вучняў гарадскіх і вясковых школак. Амаль усіх успомніў у сваёй распраменеанай паэме «Літаратурны чацвер» адданы пяюн палескае старонкі Міхась Рудкоўскі. А вось Авечкіна ў ёй няма. Чаму? — думалася не аднойчы нам, сённяшнім, ужо на шмат сівейшым і лысейшым за аратых той вялікай вайны. Адказ, як і на шмат што, знайшоў у Калесніка.

Ваяваў сын вялікаНоўгарадскай зямлі ў начной авіяцыі, якую фрыцы ахрысцілі «чортавымі млынамі». Вось што гаворыць пра баявога лётчыка з чатырохгадовым франтавым стажам Авечкіна, які вучыў сыноў нашае неабдымнае Радзімы біць немчуру ў нашым і ягоным небе і падрыхтаваў амаль 100 лётчыкаў, у тым ліку трох Герояў Савецкага Саюза, наш слынны крытык: «Далікатна перабірае добрыя прыгаршчы ордэнаў сваімі буйнымі пальцамі, спакойна, не ўзвышаючы голасу, гаворыць, але бровы прыкметна ссоўваюцца, і твар ягоны прымае велічны выраз».

Во дзе яно, во дзе сабака зарыты. Якім цудам нам, вясковай басоце, адчулася ў гэтым прыгожым і станам, і тварам чалавеку нейкая «барская» костачка, Бог яго ведае. А, далібог, мне падалося нешта ў ім ад Траякурава. Страшнавата было побач з ім. І, галоўнае, яму падабалася тая адлегласць між намі, якую ён не жадаў скараціць. Таму, пэўна, і чытанне ягонай, адшліфаванай таленавітай рукою дакументальнай прозы, як ён сам вызначыў, «для сярэдняга школьнага ўзросту», прыпала на сталыя мае ўжо гады.

Не першы раз лаўлю сябе на думцы, што літаратурнае пакаленне «бацькоў» нашых пісала, кожны ў моц свайго таленту ці вершам, ці прозаю, дзённік змагання ці з панам (Засім, Ляўчук, Ласковіч), ці з фашыстам (усе астатнія з вышэй пералічаных).

Першую аповесць Аляксандра Аляксеевіча «Саломка» Калеснік вызначыў як займальную, вострасюжэтную, насычаную прыгодамі, хочацца дабавіць — надзвычай шчырую, праўда, адзначыўшы ў ёй «некаторую псіхалагічную прастату».

Перабраўся Авечкін да нас у Брэст у 1951 годзе і пісаў, акрамя журналістыкі, толькі тое, што дасканала ведаў. А ведаў ён да драбніцаў лётную і баявую справу, ведаў маладое пакаленне краіны, узгадаванае на рэвалюцыйнай героіцы, на сумленні і сапраўдным сяброўстве, любові да роднай зямлі. Героі ягоных аповедаў — прыгожыя душою, адданыя да апошняй кропелькі крыві народу і радзіме юнакі, падлеткі, што цаною ўласнага жыцця ратуюць жыцці тых, хто трапляе ў пасткі катаў.

І Васька Асокін з абразка «Выпадак на возеры», і Рыгорка Шчаглоў з «Асобага задання» , і Клім Петушкоў з «Наперад, Буран!..», і Настачка, і Юрка з аднаіменных навэлаў, і асабліва наш палешучок Васілёк Саўчук з «Салдаты ішлі на Берлін» разам з братамі Барыскам і Пашкам Рамашкінымі з «Хлапечыя песні», і шмат іншых юных герояў з кніжак «Подзвіг сігналіста» і «Асобае заданне» клічуць сённяшнюю моладзь на «славные и добрые дела».

Браты Рамашкіны, рызыкуючы жыццём, пад носам вартавых цешаць, падтрымліваюць асуджанага на смерць фашыстамі палоннага савецкага лётчыка баявымі песнямі бурапенных часоў, і ён адказвае ім надпісам галавешкаю на сцяне беларускае сялянскае лазенкі: «Дзякую, хлопчыкі, за песні. Жывіце ў спакоі і сяброўстве. Няхай жыве Радзіма!..»

І я вам шчыра дзякую, Аляксандр Аляксеевіч, за вашу іскрыстую, самаадданую песню, як ніколі, напэўна, патрэбную нашчадкам сёння. Светлая памяць вам назаўжды. Няхай жывуць і ваша Расія, і мая Беларусь!

Аляксей ФІЛАТАЎ

ЛЯЛЬКА

Аляксандр АВЕЧКІН

Красавік сорак пятага. Месяц лотаці і пралесак. Ранне волкае, вільготнае. Сонца ледзь цярэбіцца з клочча густога чырвонага туману, змешанага з парахавым дымам. Цішыня. Упартыя прамяні ўсё часцей прасякаюць цяжкае мроіва. Па толькі што праклюнутай зялёнай травіцы ўспыхваюць яркія плямы. Туман з дымам сплываюць за ветрыкам — заўважаюцца хмызы і дрэвы.

Батальён гвардыі лейтэнанта Кашына замацаваўся паперад гарадком Дольгелін. Да Берліна кіламетраў з паўсотню. Наспела патрэба папоўніцца патронамі, снарадамі, мінамі. Не спазнілася кухня. Падыходзяць машыны з боепрыпасамі. Байцы снедаюць, увесь час пазіраючы на дамы па супрацьлеглы бок дарогі, дзе хаваўся вораг.

Туман нарэшце стаяў. У блакіце весняга неба плывуць асляпляльна белыя аблокі.

Лейтэнант метр за метрам узіраецца праз бінокль у варожую пазіцыю. Ягонае спрактыкаванае вока заўважае дбайна замаскаваныя агнявыя кропкі немцаў. Але што там на дарозе? Ля раструшчанай варожай гарматы, сярод друзу гарматных гільзаў ляжыць на ўзарваным асфальце прыгожа апранутая лялька, раскінутыя ручкі, адарваная нага, бухматы ружовы бант у ільняных валасах. Кашын паклікаў нампаліта:

— Зірні, камісар, — перадаў яму бінокль.

— Вас іс дас? — здзівіўся нампаліт. — Лялька?! — усміхнуўся патрэсканымі вуснамі.

Кашын хітнуў галавою. Ягоны худы, паросльы рыжай шчэцціу твар пасвятлеў, падабрэў.

— Доню ўспомніў? — камісар паклаў руку на сцарнелы пагон камбата.

— Так. Успомніў… — цяжка выдыхнуў лейтэнант.

У гэты момант падбег да камандзіраў невялічкі салдат з двума кацялкамі гарачай, апетытна паруючай кашы і звонка гукнуў:

— Сняданак прынёс!

— Дзякуй, Алёша, — камандзір не адарваўся ад бінокля.

…У той дзень, калі дывізіі Першага Беларускага фронта вызвалілі Брэст і з баямі рынулі за пагранічны Буг, Алёшка Саўчук, хлопчык з надбужскае вёсачкі Прылукі, прымастаколіўся да батальёна, якім камандаваў тады капітан Рубцоў. Батальённы старшына выявіў незапланаванае папаўненне і дамагаўся адправіць дабраахвотніка назад у вёску, ды салдаты адваявалі рызыканта-палешучка. Неяк адразу пацяплелі салдацкія душы ад хлапечых шэрых з весялінкаю вачэй, кірпатае бульбінкі-носа на шчыра-наіўным тварыку, густога, непаслухмянага чуба, якога ўпарта не слухалася лоўка ўшытая салдацкая пілотка.

Замацавалі Ляксейку на батальённай кухні памагатым кухара.

На пераправе праз Одэр загінуў капітан. Ягоны пераемнік Кашын меркаваў узяць рахманага падшыванца сабе ў ардынарцы, але перадумаў: на кухні спакайней крыху…

…Зазумерыў палявы тэлефон. Капітан схапіў слухаўку. Спахмурнеў тварам, слухаючы загад атакаваць Дольгелін.

— Падрыхтавацца! — сцішана прагучала каманда і пакацілася рэхам па шчылінах, акопах, кулямётных гнёздах, па ўстрывожаных сэрцах салдацкіх.

Перш чым загадаць артылерыстам і мінамётчыкам адкрыць агонь, камбат яшчэ паглядзеў у бінокль і адразу заўважыў, як з пад'езда трохпавярховіка выскачыла дзяўчынка, гадкоў пяці. Хуценька падбегла да разбітай гарматы, узняла ляльку, умасцілася на станіну і пачала дбайненька прыхарошваць сваю цацку.

Камандзірскае сэрца памлела.

— Чор-рт ведае што такое! — скрозь зубы прабурчэў камбат, замарудзіўся.

— Што здарылася? — устрывожыўся нампаліт.

— Дзяўчо на дарозе. Адкуль толькі ліха на нашу галованьку?..

Зноў адгукнуўся тэлефон. Строгі, раздражнёны голас прагудзеў злосна:

— Чаго марудзіш? Не бачу дзеяння! Наступаць!!!

Камбат, заікаючыся, растлумачыў. Пасля паўзы адказалі: «Сам прымай рашэнне, але сарвеш атаку — я цябе асабіста сам…»

Алёшка сваім кемлівым розумам неяк усенька ўсёк. Ягоныя вострыя вачаняты бачылі тую нямецкую дзяўчынку з лялькаю. Ён разумеў: марудзіць нельга, але неяк само вырвалася з грудзей:

— Таварыш камбат, дазвольце, напраміць Бог!

— Што?! Кантузіла цябе недзе ля катлоў? — але ад бінокля не адрываўся.

— Ды я кіндэр тую, кляйнэ фраў у адно імгненне сюды прывалачу!

Калі Кашын апусціў бінокль, Алёша ўжо імчаў праз калдобіны, вужом поўз ад варонкі да варонкі, пішчом церабіўся да мэдхэн. Толькі цяпер даўмеў камбат, якога дазволу дамагаўся юны чырвонаармеец — заходнік-беларус.

Фрыцы, напэўна, таксама назіралі за дарогаю, ды пакуль маўчалі. Кашын скарыстаў момант, загадаў тэрмінова адкрыць агонь дымавымі снарадамі. Праз секунду чорныя стаўбуры затулілі Алёшку. Немцы ачомаліся, усчынілі гвалтоўную страляніну. Але снайперы не бачылі Алёшу. А ён ужо дапяў мэты, ды не заўважыў дзяўчынкі. «Дзе ты, "атарочча" германскае? — замітусіўся з боку ў бок. Навокал зумкалі кулі, рэзка рэкашэцілі на жалезе. Дым паліў вочы… — А вось ты дзе! — седзячы на кукішках за гарматным колам, дзяўчынка туліла да грудак лялечку. Алёшка ўхапіў іх на рукі, куляю кінуўся да сваіх. Але малая ўпусціла з рук ляльку, у адчаі заламантавала:

— Пу-пе!.. Пу-пе!.. — рвалася з рук.

— Ціха, ціха, дурненькая. На якога д'ябла трэба табе тая лялька? Дык забіць жа могуць нас абодвух. Э-эх, дурненькая!

Калі Алёша дамкнуў да пазіцыі, батальён пад прыкрыццём магутнага артылерыйска-мінамётнага агню узвіўся ў атаку. Вораг драпаў са ўсенькіх ног.

На вуліцы нямецкага мястэчка, пад ласкавым веснім сонейкам на станіне скалечанай крупаўскай гарматы зноў сядзела нямецкая дзяўчыначка і ціхенька люляла сваё «дзіцятка»…

Да канца вайны заставаліся лічаныя дні.. Савецкія салдаты ішлі на Берлін.

Пераклад з расійскай Аляксея Філатава

НАЧНЫЯ НАТАТКІ

НЯВЫЗНАНЫЯ ШЛЯХІ...

Уладзімір СІЎЧЫКАЎ

Таксідэрміст

З дзівосным чалавекам, з земляком з ліку тых, кім варта ганарыцца, пазнаёміла мяне Галіна Іванаўна Аніскевіч, аўтарка кнігі «Жодино: история и современность». Гісторык паводле адукацыі, былая школьная настаўніца, кіруе яна цяпер групай па стварэнні жодзінскага (груваста, але так пазначана чыноўнікамі ў працоўнай кніжцы!) краязнаўчага музея. Пасля таго, як паказала мне сваю гаспадарку — будынак былога гарадскога савета, дзе мяркуецца размясціць экспазіцыю, а таксама ўжо назапашаныя экспанаты, яна запыталася: «А да Пузанкевіча не жадаеце з'ездзіць?»

Дзіва што! Пазнаёміцца са спадаром Генадзем хацеў даўно — катэдж майго стрыечнага брата Ігара з паўгода ўпрыгожвае твор гэтага майстра. Таму неўзабаве шлях наш ляжаў у вёску Судабоўка, якая ўключана цяпер у гарадскія межы. Калісь хлапчукамі няраз ездзілі паўз яе на роварах, калі выбіраліся па карасёў на возера Судабле. Можа, нават закідвалі вуды поруч з Генам, а цяпер Генадзем Канстанцінавічам, бо мы з ім амаль што аднагодкі...

Праехалі лабірынтам вуліц і завулкаў дый патрапілі да адметнай сядзібы, што ледзь не на самым беразе Плісы. Ужо па аздобе франтона з салярным знакам было відаць, што жыве і працуе тут чалавек творчы, неабыякавы да прыгажосці. На дзвярах, прымацаваны на вяровачцы, вісеў як абярэг, просты аловак.

«Надзвычай карысная рэч, — павітаўшыся, патлумачыў русабароды гаспадар. — Асабліва выручаў, калі яшчэ не было тэлефона. Той, хто не заспяваў мяне дома, мог напісаць запіску, а калі меў яшчэ што пакінуць, дык ведаў, што камора ў мяне заўсёды адчыненая».

А найчасцей спадару Генадзю прыносяць свае трафеі паляўнічыя. Нярэдка загінулых птушак, галоўная небяспека якім — высакавольтныя электралініі, што цягнуцца ад цеплаэлектрацэнтралі, прыносяць і падлеткі.

Справа ў тым, што акрамя прафесій лесніка, пчаляра, цесляра, садоўніка, фотамастака авалодаў гаспадар сядзібы і вельмі рэдкаю — майстра таксідэрмічных скульптур. А калі расшыфраваць, патлумачыць мудрагелістае слова «таксідэрміст» (ад грэч. taksis = будаўніцтва + дэрма), дык вырабляе ён пудзілы птушак і жывёлаў. Прычым настолькі па-майстэрску, што проста дзівуешся! Дый не проста пудзілы, а нярэдка з «разынкаю», са знаходкаю ў кампазіцыі, з мяккім гумарам. На пакручастай сасновай галіне суседнічаюць самая вялікая і самая малая совы, якія вядуцца на Беларусі, — барадатая кугакаўка і вераб'іны сычык. Ліса ўпалявала і моцна трымае ў пашчы курапатку, а тры зайцы застылі ў вобразе паляўнічых — са стрэльбамі, патранташамі, у заліхвацкіх капелюшах!


Фота Алесі Сіўчыкавай

Помнік Хансу Крысціяну Андэрсэну ў Цэнтрал-парку ў Нью-Ёрку

Цяжка даць веры, але ў гэтым своеасаблівым музеі дзвесце шэсцьдзясят (!) экспанатаў! Сто шэсцьдзясят прадстаўляюць айчынную фаўну, але нямала й «гасцей»: птушкі, экзатычныя рыбы і нават алігатар.

Паказаў спадар Генадзь і святая святых — майстэрню, у якой шчыруе разам з жонкай Тацянаю. Адны пудзілы робіцца тут з нагоды, другія — для душы, але нямала і па замовах музеяў, лясніцтваў, запаведнікаў, паляўнічых гаспадарак і навуковых установ. Сярод прыватных замоўцаў — найчасцей паляўнічыя і рыбаловы, прычым не толькі з Беларусі або суседніх краін. Бывала, што адпраўляліся Генадзевы творы (язык не паварочваецца казаць — вырабы!) у Італію, у Нямеччыну, на Кіпр.

Уразілі таксама энцыклапедычныя веды гаспадара ў галіне арніталогіі. Уражанне, што пра птушак, прынамсі, пра беларускіх, якіх з нядаўнім з'яўленнем стэпавага арла, налічваецца трыста адзінаццаць відаў, ведае ён усё. І не толькі ведае — ахвотна і захоплена ведамі тымі дзеліцца. Праводзіць па сваёй сядзібе экскурсіі ад школ і прадпрыемстваў, кансультуе кнігавыдаўцоў і нават збірае навуковыя дадзеныя акадэмічнаму Інстытуту заалогіі! Прычым робіць усё гэта бескарысліва.

Можна было б спытацца, адкуль тыя веды ў выпускніка ўсяго толькі Барысаўскай лясной вучэльні — СПТВ-42? Адказ вельмі просты: апантанасць, цікаўнасць і штодзённая самаадукацыя. А калі дадаць сюды фенаменальную працавітасць і працаздольнасць, дык становіцца зразумелым, чаму сёння на падворку і пры садзе суседзяцца, да прыкладу, вальеры з фазанамі залацістым, срэбным і зялёным румынскім, а ледзь не поруч са свойскімі жывёламі някепска пачуваецца і... нільскі кракадзіл! Здавалася б, невялікае дзіва — сажалка з карпамі, карасямі, лінамі ды шчупакамі. Але ж трэба было выбіць пад яе дазвол гарадскіх уладаў, а калі сажалку тую Пузанкевічы выкапалі, дык і ўдзячныя суседзі паразбівалі свае грады на месцы былой балаціны.

А колькі дзівосаў у аранжарэі: семдзесят пяць відаў раслінаў! Уражвае і сад, дзе можна пабачыць пасадкі кедрача, дзялку з радыёлай ружовай (падобную маю сам на Лысай Гары!), грушы, прышчэпленыя на рабіне, яблыню, што прыносіць плады трынаццаці гатункаў! А ў двары — кветнікі, пярголы з некалькімі вінаградными лозамі, альпійскія горкі, а неўзабаве, упэўнены, можна будзе ўбачыць фантанчыкі і водаспадзікі, бо старэйшая дачка Алена ўжо год як адвучылася ў тэхналагічным універсітэце па спецыяльнасці «Ландшафтны дызайн». Старэйшы сын Віктар пайшоў бацькавай сцяжынай, скончыў Барысаўскі прафесійны экалагічны ліцэй. Нават здалёк было чуваць ягоную сякеру — намерыўся будавацца поруч. Відочна, Пузанкевічавы абсягі пашыраюцца.

Малодшыя, прыёмныя дзеці, школьнікі Вольга з Сашам мудрагелілі на кухні, а потым частавалі сваім печывам і шарлоткай з адмысловай гарбатаю.

А яшчэ за пачастунак былі... фотаальбомы. Прытым не аматарскія падборкі, а цэлыя фаліянты-справаздачы пра падарожжы па Беларусі, па Архангельскім краі і Карэліі, па Паволжы і Сібіры, па Прымор'і і Далёкім Усходзе. А яшчэ па выключна багатай раслінным светам выспе Шры Ланка. Па далёкай Кеніі, знакамітай сваімі запаведнікамі з мноствам найцікавейшых прадстаўнікоў фаўны, якія абсалютна індэферэнтна ставяцца да турыстаў і падарожнікаў. А непалахлівыя яны таму, што ў той экватарыяльнай афрыканскай краіне паляваць забаронена. Хаця не, ёсць два выключэнні. Турысты могуць паляваць з фота- і відэакамерамі, а плямёны тубыльцаў кшталту знакамітых масаяў, што жывуць па-за сучаснай цывілізацыяй, — з коп'ямі і стрэламі.

Каментарыі да некаторых здымкаў, бывала, пераўтвараліся ў мінінавэлы. Напрыклад, дзеля таго, каб некалькі разоў шчоўкнуў затвор старога незаменнага «Зеніта», спадару Генадзю даводзілася часам маскавацца і нерухома праседжваць на дрэве не адну гадзіну.

Дарэчы, на час трэба было зважаць і нам, тым болей, што залева, падчас якой мы раскашавалі ў хаце, скончылася.

Выбіраліся ад ветлівых і гасцінных гаспадароў, і мімаволі прыгадваў я вёску Мосар на Глыбоччыне, дзе за некалькі гадоў тамтэйшы пробашч Язэп Булька з дапамогаю вернікаў ператварыў у рукатворны Эдэм не толькі прыкасцёльную тэрыторыю, але і ўсё наваколле...

Хацелася яшчэ раз вярнуцца ў Судабоўку ў дружную сям'ю і на дзівосную сядзібу Пузанкевічаў. Вярнуцца, каб яшчэ раз убачыць надзіва прыязныя, з вясёлымі праменьчыкамі зморшчынак, вочы, каб яшчэ раз адчуць моцны поціск рукі жодзінскага цудадзея...

21 кастрычніка 2007 г.

Бог не роўна дзеліць

Пасля дванаццатай гадзіны пайшоў доўгачаканы дождж, а следам прыляцела нечакана-трагічная тэлефонная вестка, што ў Цвяры на сваім 71 годзе памёр ад інсульту дзядзька Коля, матулін брат. Нарадзіўся ён на Каляды зласвеснага 1937-га.

Год найбольшага размаху сталінскага тэрору закрануў і ягонага бацьку, а майго дзеда Кузьму, на той час вясковага пісара — за неасцярожнае крытычнае слова на адрас старшыні калгаса той патрапіў на пензенскі лесапавал. Але пашанцавала — адпусцілі парадавацца сыну, якому і запісаў шчаслівы бацька за дату нараджэння 9 студзеня 1938 года, каб, як тады казалі, падчас прызыву ў войска не ішоў год наперад.

Дзядзька Коля быў самы малодшы ў сваёй сям'і, але па горкай іроніі лёсу адышоў у іншы свет раней за ўсіх трох сясцёр, якія трываюць, нягледзячы на даўні паралюш найстарэйшай Вольгі дый усе іншыя хворасці.

Цяжка мэнчыўся я, покуль не ўсвядоміў адной з прычынаў, чаму так і не змаглося паехаць на хаўтуры: не хацеў убачыць васковую мумію, а хацеў запомніць яго жывым. Хай сабе й не маладым, а хаця б такім, якім бачыў апошняга разу, пазалетась.

24 жніўня 2008 г.

«Нам не дано предугадать, Как наше слово отзовется...»

Найвялікшага дацкага літаратара Ханса Крысціяна Андэрсэна (Christian Andersen, 1805–1875) спецыялісты-філолагі ведаюць і як паэта, і як празаіка, і як драматурга. Але чытачы ва ўсім свеце, як дарослыя, так і дзеці, ведаюць і цэняць яго найперш як казачніка. Хто не чытаў або не слухаў такія ягоныя шэдэўры, як «Брыдкае качаня», «Дзікія лебедзі», «Дзяўчынка, якая наступіла на хлеб», «Дзюймовачка», «Новая каралёва світка», «Прынцэса на гароху», «Русалачка» ці «Снежная каралева»?! Гучаць яны і сёння, да прыкладу, у нью-ёркскім Цэнтрал-парку каля помніка пісьменніку.

Але сам Андэрсэн недалюбліваў і недаацэньваў казкі, якія прынеслі яму заслужаную славу, марна стараўся праславіцца як раманіст і аўтар п'ес. Больш за тое, менавіта дзякуючы сваім казкам пісьменнік стаўся ці не самым знаным у свеце датчанінам. Поруч з Андэрсэнам можа стаць хіба што паўлегендарны, услаўлены якраз драматычным талентам Уільяма Шэкспіра Гамлет, прынц дацкі.

Нявызнаныя шляхі Божыя!

Ірландзец паводле нацыянальнасці, шатландзец паводле месца нараджэння, брытанец паводле выхавання — англійскі празаік, драматург, паэт і публіцыст Артур Конан Дойл (1859–1930) выдаў тры кнігі паэзіі, некалькі гістарычных і прыгодніцкіх раманаў, тамы аўтабіяграфічных нарысаў, філасофскія творы, напісаў паўдзясятка п'ес, ахвотна працаваў у новым на той час жанры навуковай фантастыкі («Прыхаваны свет» пра таямнічае плато з дапатопнымі яшчарамі пасярод Амазонскай сельвы, «Маракотава бездань» пра Атлантыду, якая апусцілася на акіянічнае дно). Ён здолеў стварыць запамінальныя вобразы пірата Шаркі, няўрымслівага прафесара Чэленджара, брыгадзіра напалеонаўскага войска Жэрара. Але ніводзін з ягоных герояў не быў настолькі папулярны, як прыватны дэтэктыў Шэрлак Холмс — ад «Эцюда ў барвовых танах» (1888) да «Архіва Шэрлака Холмса» (1927). Дзякуючы сваім творам Артур Конан Дойл стаўся не толькі знаным на ўсім свеце літаратарам, якому наследавалі многія дэтэктыўшчыкі, але і выперадзіў некаторыя прыёмы і методыкі ў крыміналістыцы. Да свайго героя аўтар ставіўся досыць скептычна і нават «забіў» яго ў двубоі з каралём злачыннага свету прафесарам Марыярці. Аднак праз дзесяць гадоў Дойл вымушаны быў «уваскрасіць» Шэрлака Холмса, які неверагодна палюбіўся чытачам.

Нявызнаныя шляхі Божыя!

Беларускі пісьменнік Алесь Якімовіч (1904–1979) пісаў пераважна для дзяцей. Ён выдаў некалькі кніжак вершаў і апавяданняў, літаратурныя казкі ў вершах і ў прозе «Каваль Вярнідуб», чытэльныя аповесці «Канец сервітуту» і «Кастусь Каліноўскі», быў аўтарам падручнікаў і складальнікам чытанак, выступаў і як перакладчык. Але наўрад ці мог ён уявіць, што самымі запатрабаванымі з ягонай творчай спадчыны, надрукаванымі мільённымі накладамі, акажуцца... апрацоўкі беларускіх народных казак.

«Каток — залаты лабок» (1955), «Бацькаў дар» (1957), «З рога ўсяго многа» (1959), «Андрэй за ўсіх мудрэй» (1983) — ад сярэдзіны пяцідзясятых гадоў мінулага стагоддзя і да сённяшніх дзён зборнікі казак менавіта ў ягоных перастварэннях выходзяць з зайздроснай рэгулярнасцю.

Нявызнаныя шляхі Божыя!

19 чэрвеня 2013 года

АПОВЕД

ЦЫРУЛЬНІК

КАЗКА ДЛЯ ДАРОСЛЫХ І ДЗЯЦЕЙ

Валеры ГАПЕЕЎ



Вы ці сустракалі ў якім правінцыйным гарадку мужчыну-цырульніка? І я даўно нідзе не бачу такога. Дзіўна, праўда: некалі толькі мужчыны і былі цырульнікамі…

У нас гарадок невялікі, тысяч пяць жыхароў. Ёсць цырульня. Тады там дзве жанчыны працавалі: адна кабеціна мажная, цыцкі з мужчынскую галаву, мужчын стрыгла, а яе напарніца, хударлявая, нярвовая, як карова першы раз пасля зімы на пашы, — жанчын. Ну, маладзейшыя нашы жыхары за моднымі прычоскамі ездзілі ў суседні горад.

Гарадок наш — як усе, звычайна-змрочны, і людзі звычайныя: стомленыя, прыгнечаныя…

Адной вясной, толькі пачало з-пад бруднага снегу паказвацца ўсё пахаванае ім за зіму смецце, прыйшоў у цырульню мужчына сярэдняга веку. І кажа: я цырульнік, вазьміце мяне на працу. Тут і дваім працы асаблівa няма, але нешта ў цырульніц настрою гэтак не было, што яны рашылі: а няхай і ён сябе адчуе такім вось няшчасным, як яны самі, хай пачакае днямі сваіх кліентаў… Мо і людзі стануць прыходзіць, дзівіцца на такі цуд: мужчына-цырульнік.

І праўда, мужчына-цырульнік доўга чакаў свайго першага кліента. Ім сталася адна наша вядомая хворая на галаву жанчына. Ну, не тое, каб зусім хворая, на каханне хворая. Як вясна — так яна закохваецца. У наступнага жанатага. І праследуе днямі і начамі. Ёй жанкі і твар дралі, і валасы выдзіралі, і на галаву масла аўтамабільнае лілі. З яе мужыкі, у якіх яна закохвалася, смяяліся, каторыя смялейшыя. Іншыя пабойваліся, уцякалі. Каму трэба такая любоў?

Дык вось, прыйшла гэтая жанчына ў цырульню. А тут вясна, трое кліентаў: дваіх стрыгуць жанчыны, мужчына адзін чакае. А цырульнік толькі вінавата ўсміхаецца — сядзіць без працы.

Наша закаханая жанчына раптам да яго.

— Вы таксама стрыжаце?

— Канешне.

— Пастрыжыце мяне! Я зараз пайду труціцца.

Ну, гэта таксама не навіна: кожную вясну нашу небараку ратавалі дактары.

— Гэта вельмі правільна, — кажа весела цырульнік. Падхапіўся з месца, пасадзіў жанчыну, новенькай як накрыў. — Вельмі правільна паміраць прыгожай — на тым свеце такая прыгажосць, як Вашая, вельмі дорага каштуе!

Тут у цырульні натапарылі вушы — што гэта такое сказаў цырульнік?

— Якая такая прыгажосць? — аж зніякавела закаханая жанчына.

— Звычайная! — усклікнуў майстар. — Зараз мы яе толькі самую крышачку прыадкрыем… Вось гэтую пасмачку валасоў падрэжам і сюды павернем, вось тут крышачку падбярэм… Ай, якое вушка — такое мілае! Трэба нам і яго прыадкрыць… Вось, і Вашая завушніца проста зайграла, ай якія ў Вас вушкі…

А сам вакол жанчыны з нажніцамі: шысць-шысць, цак-цак.

Ціха ў цырульні стала. Жанчыны-майстры сваіх стрыгуць і паглядваюць, паглядваюць… А глядзець ёсць на што: жанчына ўвачавідкі мяняецца! У вачах замест хваравітага агеньчыка тугі імклівa разгараецца загадкавае святло жаноцкай таямнічасці, разгладжваюцца тонкія маршчынкі адзіноты і суму, прыкрасці і незадаволенасці ля вачэй, ля вуснаў…

Закончыў цырульнік, адкінуў накрыўку, а жанчына глядзіць на сябе ў люстэрка і кажа:

— Гэта ж і па-праўдзе шчасце, калі я магу кахаць, так жа?

— Канешне! — кажа майстар. — У Вас вялікае сэрца. І яго абавязкова нехта пачуе!

Вось так у нашым горадзе з'явілася першая шчаслівая жанчына. Першая жанчына, якая ішла вясновым днём — і ўсміхалася сонцу і сустрэчным людзям.

А назаўтра цырульнік прывёў аднекуль з вуліцы бамжа і пасадзіў яго ў крэсла. Гэтага бамжа ведалі ўсе ў горадзе, бо ён прасіў грошы на выпіўку ва ўсіх і па некалькі разоў. Бомж быў брудны і ад яго тхнула непрыемна, але майстрыхі змаўчалі, бо ўсё адно ў цырульні нікога больш не было.

Калі майстар закончыў і раскрыў бамжа, усе раптам пабачылі, што яго галава і твар чужыя для яго тулава. І бомж тое зразумеў. Ён глядзеў на сябе ў люстэрка і бязгучна плакаў. А потым пайшоў, не падзякаваўшы. Праз гадзіну за расчыненым акном (выветрывалі бамжакі дух) жанчыны пабачылі, як ён самаробнай мятлой з бярозавых галінак вымятае чыста-чыста ўсё вакол цырульні. Бліжэй к вечару ён прынёс аднекуль вядро з белай разведзенай вапнай і стаў мазаць самаробным квачом шэрыя сцены цырульні. Назаўтра ён быў ужо ў прафесійнай форме работніка камунальнай службы, чыста паголены, цвярозы, як шкліна — і мёў усю вялізную прывакзальную плошчу, збоку якой месціцца цырульня.

Трэцім кліентам нашага цырульніка стаў муж той самай грудастай майстрыхі (жанчыны першыя аб усім здагадваюцца). Гэта быў ціхі, забіты мужычок. Некалі ён працаваў на заводзе інжынерам, пакуль той не закрылі. Казалі, што ён быў вельмі разумны, але ж гэткі баязлівы, нерашучы.

Цырульнік падстрыг мужа майстрыхі. Ён доўга сядзеў у крэсле пасля таго, як майстар сказаў: «Усё!», узіраўся ў сябе так, быццам разглядаў не свой твар, а свае мазгі. Падзякаваў, расплаціўся і пайшоў. Назаўтра ён узяў крэдыт у банку, выкупіў пусты цэх завода. Потым прыехалі грузавікі і прывезлі станкі. Загула там праца…

І скемілі хутка ў горадзе, што за майстар-цырульнік у нас з'явіўся. Жанкі вялі да майстра сваіх мужоў-п'янтосаў, мужы — сваіх раўнівых жонак, бацькі — неслухмяных дзяцей.

Шысць-шысць, цак-цак, — чулася музыка нажніцаў з адчыненага акна цырульні, і развіталіся з чарговай галавой няўпэўненасць і лянота, падалі долу злосць і зайздрасць, усцілалі падлогу абрэзаныя абыякавасць і раўнадушша, церушыліся чорным ды русым сняжком дзіцячыя непаслухмянасць, задзірыстасць, грубасць, агрэсіўнасць.

Чарга да майстра дзень і ноч стаяла. То тады па іншаму яго праца пайшла: ён толькі пачне і кажа:

— А вось зараз Настачка закончыць, лепш чым я, зробіць… А вось цяпер лепш Вам да Галечкі, у яе зграбней атрымаецца для Вашай галоўкі…

Аднойчы сабраў усе абстрыжаныя валасы цырульнік і стаў паліць іх прама ў двары цырульні. Гэткі смурод накрыў горад… І ўспомнілі мы ўсе, якія бываюць смуроды… І памяць наша вярнулася — аж да дваццаць першага калена.

Што тут вам далей казаць? Не пазнаць стала наш горад. Усмешкамі расцвіў, ветлівасцю свеціцца, шчасцем ззяе. Хто за што добрае ні возьмецца — усё атрымліваецца, справы ладзяцца. Урэшце і наш гарадскі галава да майстра схадзіў. Назаўтра ж загадаў усе будынкі, што пустымі сталі з-за зачыненых прадпрыемстваў, за капейкі людзям раздаць, каб ладзілі там свае справы. Сам у вобласць паехаў. Інвестараў адшукаў — новы завод у нас пабудавалі, вялікі і сучасны. Турма ў нас у горадзе была — то яе далёка за лес перанеслі, а той самы касцёл, што на яе тэрыторыі разбуранам ад часоў вайны стаяў, узнавілі, служба там цяпер ідзе святочная. І кляштар, у якім кабінеты сабе яшчэ энкавэдзісты парабілі, аднавілі, і ён не пустуе…

Вось… Да нас людзі сталі ездзіць на гарадскі кірмаш, як у музей: не столькі купіць, колькі па горадзе пагуляць, у светлых ад ветлівасці кафэ пасядзець, на простых шчаслівых людзей падзівіцца. А мы свой сакрэт беражэм, харонім ад чужынцаў — ведаем, што кожнаму ў час пастрыгчыся трэба. Бо як стануць аднекуль яшчэ ездзіць, дзе ў майстра-цырульніка часу хопіць на такую грамаду?

А потым з'явілася ў нашай цырульні абвестка: «Вазьму ў вучні хлопца. Цырульнік».

Доўга яна вісела, цэлы месяц. Ды дарма. Хто ж сёння з маладых хлопцаў думае пра працу цырульніка ў нейкім правінцыйным горадзе? Гэта ж не недзе ў Мінску ў якім мадняўчым салоне рабіць прычоскі тлустым цёткам і іх лялечным сабакам…

Мінуў той месяц. І адным цёплым восеньскім ранкам не пабачылі мы майстра ў нашай цырульні. Разгубленыя Галіна і Наста згадвалі ўсім тое, што сказаў ім пры развітанні майстар — на іх просьбу пакінуць свае чароўныя нажніцы: «Справа не ў нажніцах, а ў жаданні іх трымаць».

Наш гарадок сёння — такі ж, якім быў некалі… яшчэ да майстра. І таму я пытаюся ў вас: ці сустракалі вы ў якім правінцыйным гарадку мужчыну-цырульніка?

Разгубленыя Галіна і Наста згадвалі ўсім тое, што сказаў ім пры развітанні майстар — на іх просьбу пакінуць свае чароўныя нажніцы: «Справа не ў нажніцах, а ў жаданні іх трымаць»

АПАВЯДАННЕ

МАТЫЛЁК З НЮРНБЕРГА

Анатоль САНАЦЕНКА

Успаміны пра яе займаюць самы пяшчотны перыяд майго жыцця.

Я быў малады, свежы, адзінокі і яшчэ патрабаваў ад свету паразумення.

Мая журналісцкая кар'ера развівалася ўдала: праз два гады працы я быў пасланы ў Норск галоўным рэдактарам рэгіянальнага дадатку «Часу». Кватэра, машына, пад'ёмныя — прыкладаліся.

І ўвесь час, пакуль я ехаў на новае месца, пад радасны перастук колаў цягніка маё сэрца замірала ад прадчування немагчымага шчасця…

На новым месцы я ўзяўся за справу з цікавасцю, з густам, знайшоў слабыя месцы ў бюджэце газеты і праз паўгода прыкметна павялічыў яе прыбытковасць.

Наш рэгіянальны дадатак рыхтаваўся адзначыць сваё дзесяцігоддзе. Акрамя ўсяго іншага, гэта была выдатная магчымасць умацаваць і пашырыць чытацкія шэрагі.

Цэнтральны офіс ухваліў падрыхтаваны мною план урачыстых мерапрыемстваў. За дапамогай у складанні сцэнара і правядзення свята я звярнуўся ў аддзел культуры мясцовай адміністрацыі. Там мне парэкамендавалі загадчыцу літаратурнай часткі мясцовага тэатра — «надзвычай адоранага чалавека», як сказалі ў адміністрацыі.

Я паслухаўся іх парады.

— Таццяна Царова, — праспявала юная істота, падаючы мне сваю цёплую далонь. Я разгублена патрымаўся за яе далікатную, даверлівую руку, якую мне неяк адразу не захацелася адпускаць, затым прадставіўся.

— А я вас ведаю.

—?

— Так, так. Не здзіўляйцеся. Я — адданая чытачка вашага выдання, вашых выдатных артыкулаў...

— Не, я вас нікому б не аддаў… — перапыніў я яе, каб скаламбурыць з такой нагоды, якую я, па сваёй колішняй звычцы, стараўся ніколі не прапускаць.

Яна замерла на імгненне, уважліва паглядзела на мяне і засмяялася, заліўся смехам, завінела званочкам…

Мы пасябравалі.

Яна была таленавіта прыгожая. Чыстая лінія яе твару заставалася ў сэрцы раз і назаўсёды.

Кожны яе рух быў геніяльным! І тое, як яна ішла па вуліцы, і тое, як уваходзіла ў памяшканне, і як прысядала на краёчак крэсла, — усё гэта было незвычайна, незвычайна... Вядома, я закахаўся…

Юбілейныя святкаванні прайшлі выдатна. Норск ніколі не бачыў нічога падобнага. Урачысты вечар у тэатры, званы вечар для мясцовай эліты ў рэстаране, назаўтра — канцэртная праграма ў гарадскім парку з удзелам сталічных зорак, увечары — вулічны карнавал, тэатралізаваныя прадстаўленні, конкурсы, латарэі…

І ўсе гэтыя дні Таццяна была побач. Калі яна, у святле сафітаў, падымалася на сцэну тэатра, я — у думках — кідаўся на доўгія захопленыя погляды, пасыланыя ёй з залы іншымі мужчынамі. Што ім незразумела: яна — мая!.. Мая!..

Да канца ўрачыстасцяў Таццяна, — яе вобраз, яе голас, усё яе быццё — пранiклі ў мяне настолькі, што, здавалася, сталі арганічнай, прыроднай часткай маёй істоты.

А што ж яна? Якія пачуцці былі ў яе?.. Гэта да пары да часу было для мяне загадкай.

Лічачы сябе спецыялістам па частцы жаночай псіхалогіі (як потым аказалася — неразважліва), я ўсё не мог зразумець, не мог разабрацца, што рухае ёю. Хоць потым мы і сталі блізкія...

Так, здавалася б, яна была ветлівай са мной, спрыяла мне як мужчыне… (Назаўжды застаўся ўва мне «вадзяным малюнкам», бачным толькі на прасвет памяці, наступны шэдэўральны сюжэт: яна і я ў пустым паўцёмным зале тэатра, у якім больш нікога, бо вартаўнік захварэў; яна са сцэны чытае Шэкспіра, з чароўнай усмешкай паступова вызваляецца ад адзення і ў фінале падае ў партэр, да мяне на рукі...). Але калі я спрабаваў завесці гаворку аб сваім пачуцці, аб тым, што я жадаю быць з ёй побач — і ў смутку, і ў радасці, і ў хваробе, і ў здароўі, — Таццяна рабілася сумнай і спыняла мяне.

«Не трэба пра гэта», — ціха прасіла яна. І дадавала: «Ты зусім мяне не ведаеш». — «Ну дык раскажы пра сябе, каб я ўсё-ўсё-ўсё ведаў пра маю радасць», — казаў я, абдымаючы яе, імкнучыся перавесці размову ў жартоўную танальнасць, паколькі гэтая яе змрочнасць чамусьці мяне палохала. «Другім разам», — без усякай надзеі адказала Таццяна.

Падпускаючы да сябе, яна не дазваляла мне пранікнуць у яе душу. Пакідаючы сваю душу (я адчуваў гэта выразна) свабоднай.

Між тым пачуццё маё расло не па днях, а па гадзінах. Валодання яе цэлам мне было недастаткова, я хацеў валодаць ёю цалкам. Я хацеў увайсці ў яе душу і застацца ў ёй назаўжды. Але, дзелячы ложак, яна не хацела дзяліць са мною сваё жыццё. І гэта я таксама разумеў.

І ўсё ж я быў шчаслівы. Няхай шчасце маё і мела прысмак горычы, я быў шчаслівы з ёй, навучыўшыся жыць імгненным, не думаць пра будучыню... Памятаю, як яна, узбуджаная нейкімі падзеямі, без званка ўрывалася ў маю кватэру (я забяспечыў яе дублікатам ключоў), — шумная, жудасна мілая ў сваёй эмацыйнай ускудлачанасці… Я супакойваў яе доўгім пацалункам у вусны, садзіў на канапу — і мы аддаваліся ўсім тым пяшчотам кахання, на якія толькі былі здольныя... Успамінаю таксама, як часам, утульна цёплымі летнімі вечарамі, у канцы працоўнага дня, яна прыходзіла да мяне ў рэдакцыю. Застаўшыся адны, мы былі нястрымныя ў сваіх памкненнях…

Здзіўляла і трывожыла мяне ў ёй таксама тое, што яна ніколі не заставалася ў мяне на ноч, нібы яе ночы былі прызначаны камусьці іншаму. Я быў упэўнены ў тым, што, акрамя мяне, у яе нікога няма. Але зразумець гэтай яе асаблівасці — не мог.

Узяўшы ў ліпені адпачынак, я павёз яе за мяжу.

Некалькі дзён у Варшаве, некалькі дзён — у Берліне.

Употай я хацеў мацней прывязаць яе да сябе, адчуваючы набліжэнне чагосьці драматычнага, што можа яе забраць…

Валодання яе цэлам мне было недастаткова, я хацеў валодаць ёю цалкам. Я хацеў увайсці ў яе душу і застацца ў ёй назаўжды. Але, дзелячы ложак, яна не хацела дзяліць са мною сваё жыццё

У Варшаве мы жылі ў невялікай утульнай гасцініцы, недалёка ад цэнтра. Сілкаваліся ў кітайскім рэстаранчыку. На абед заказвалі італьянскае віно, суп з крэветкамі, складана запечаную рыбу...

Аб'ездзіўшы і абышоўшы пешшу ўвесь горад уздоўж і ўпоперак, мы любілі вяртацца ў Стара Място, на сярэднявечную ціхую плошчу, акружаную з усіх бакоў рознакаляровымі дамамі, якія пяшчотна туліліся адзін да аднаго.

Мы прысаджваліся на чыгунную лаўку і павольна вывучалі ўсё навокал. Мінакі, вулічныя мастакі; гэтыя, быццам цацачныя, домікі, — іх фасады, дзверы, вокны; краму антыкварыяту; уваход у музей Адама Міцкевіча...

«Уяўляеш, тут жылі — нараджаліся, любілі, памiралі — за пяцьсот гадоў да нашага з'яўлення на свет, — дзівілася яна і летуценна клала галаву мне на плячо. — Цікава, а як гэта — жыць у такім вось доме, з такой вось старажытнай гісторыяй?» — гаварыла яна, гледзячы на жанчыну, якая ключом адчыняла дзверы насупраць нас, каб увайсці ў будынак. (Потым я даведаўся, што гэтыя дамы — толькі прывід будынкаў, разбураных падчас вайны...).

У цягніку «Варшава–Берлін» яна раптам стала маўклівай. А затым, пільна паглядзеўшы на мяне доўгім позіркам, прызналася. Яна ва ўсім прызналася ...

Яго завуць Аляксандр Куракоў. Ён — прафесар, яе інстытуцкі настаўнік. Цяпер у Нямеччыне, на гастролях, — са сваім тэатрам-студыяй, які стварыў, калі Таня вучылася ў яго…

Я выйшаў з купэ, апусціў у тамбуры акно. Цёплае начное паветра не астуджала майго палаючага твару. Калі вярнуўся, яна спала, зграбнуўшыся абаранкам.

Раніцай мы не прамовілі ні слова…

У Берліне мне стала зусім дрэнна, невыносна дрэнна.

Пакінуўшы Таццяну ў гасцініцы, я гадзінамі блукаў па горадзе.

Усё прычыняла мне пакуты: шкляныя вітрыны крам на Кюрфюрстэндам, жыццярадасна страляючыя сонечнымі прамянямі; пяшчотнае вуркатанне закаханай парачкі, якая абагнала мяне на павароце вуліцы; глыбокі ўздых двух'яруснага аўтобуса, што ветліва адчыняў свае дзверы, ветліва схіляўся да тратуара...

За паваротам аднаго з дамоў — чорныя, гладкія, бліскучыя панэлі — нечакана выйшаў да Шпрэе, і задыхнуўся — ад болю, ад сонечнага прастору, які адкрыўся вачам… Пакутлівыя, сухія рыданні вырваліся з маіх грудзей. Стрымліваць іх у мяне ўжо не было сілаў. Закрыўшы твар рукамі і прыціснуўшыся да сцяны нейкага дома, я бязгучна ўздрыгваў усім целам у спазмах бясслёзнага плачу.

Мяне кранулі за плячо. Светлавалосы пажылы немец спагадліва пацікавіўся, што са мной. Зрабіўшы міжнародны жэст, які азначаў: «Усё ў парадку», — я пайшоў уздоўж ракі. «Мая бедная зялёнавалосая Ларэлея! Я гіну ад тваіх чараў»…

У гасцініцы яе ўжо не было. На пісьмовым стале, — вось так проста, звычайна, будзённа — ляжала запіска. «Ён у Берліне. Мая душа належыць яму. Прабач».

Сяк-так сабраўшы рэчы ў дарожны чамадан, паехаў на вакзал.

Цягнік адпраўляўся праз сорак хвілінаў. Чакаючы пазначаны ў білеце час, без мэты блукаў па вакзале, — сядзець на адным месцы было невыноснай пакутай…

Наткнуўшыся на газетны кіёск, купіў свежы «DER TAGESSPIEGEL», пачаў аўтаматычна праглядаць яго.

У раздзеле «Культура» пісалі пра гастролі эксперыментальнага тэатра пад кіраўніцтвам Куракова. Як я зразумеў, пісалася там шмат пахвальнага. Гэта было зусім ужо нясцерпна. Я скамячыў газету…

Абвясцілі пасадку. Увайшоўшы ў купэ, я зачыніў за сабою дзверы, але праз хвіліну ў іх ветліва пастукалі.

Аказалася, мой суайчыннік; вяртаецца на радзіму.

Ніякага жадання размаўляць у мяне не было, але мой сусед па купэ, на няшчасце, быў п'яны і гаваркі. Нейкі час я не ўпускаў яго балбатню ў сваю свядомасць, якая была аглушана сапраўдным чалавечым горам. Затым стаў няўцямна прыслухоўвацца…

З яго маналогу я зразумеў, што ён — акцёр, пасварыўся з рэжысёрам — з-за дробязі, але для яго — прынцыповай рэчы. Разарваў кантракт і цяпер вяртаецца дадому. Нагаманіўшыся, ён змоўк. Сядзеў за сталом, падпёршы галаву кулаком. Затым дастаў з сумкі пляскатую бутэльку з каньяком, наліў сабе і прапанаваў мне. Я адмовіўся.

Выпіўшы, ён папрасіў паглядзець газету, якую я, з-за няўважлівасці, прыцягнуў з сабою ў купэ.

Расправіўшы і пагартаўшы яе, ён нечакана ўсклікнуў: «А-а-а, і тут спадар Куракоў!» — «Вы яго ведаеце?» — зацікавіўся я. — «Як жа, як жа, ведаем-с. Яшчэ як ведаем-с! — Чамусьці старамодна адказаў ён мне. — Сволач прыстойная». — «Што так?» — «Ды вось так! Доўга тлумачыць, але калі вы хочаце... » — «А ці ведаеце вы Таццяну Царову? — перапыніў я яго. — Яна быццам бы мае нейкае дачыненне да тэатра Куракова...» — «І самае непасрэднае. Яшчэ тая штучка, скажу я вам. Мала таго, што, яна — актрыса тэатра Куракова, — два гады таму ледзь не разбіла яго сям'ю (зрэшты, я не моцна перажываю з гэтай нагоды), дык, уявіце сабе: на днях зноў заявілася да яго — тут, у Берліне. І паміж імі зноў пачалося... Каханне, разумееце. Пачуццё! Між тым розніца ва ўзросце — дваццаць гадоў!..»

Вярнуўшыся ў Норск, я адчуў нясцерпнае жаданне здзейсніць які-небудзь гвалт над сабой, над сваім лёсам…

Я звольніўся з газеты і падаўся ў сталіцу. Там і заспела мяне вестка аб яе гібелі ў аўтамабільнай катастрофе, — на горнай дарозе ў Швецыі, у машыне Куракова, які, між тым, застаўся жывы.

А праз два тыдні пасля гэтага па пошце прыйшоў вялікі жоўты канверт, упрыгожаны маркамі тых месцаў, дзе ён, у пошуках мяне, паспеў пабываць.

Яе рукой на ім старанна было выведзена маё імя і адрас.

Нічога не разумеючы, я, у смутку і жаху, разарваў яго і тут жа здрыгануўся ўсім целам, усёй душою: да ног з канверта выпырхнуў велізарны, яркі матылёк.

Гэта была акуратна выразаная з нямецкай паштоўкі крапіўніца (яна памятала пра маю любоў да прозы Набокава).

На адваротным баку несмяротна дарагім мне почыркам… «Мілы Сашанька, гэты матылёк паспеху прыляцеў да цябе з Нюрнберга. Будзь шчаслівы. Прашу цябе, будзь шчаслівы…»

Я не змог выканаць гэтую просьбу…

ВЕРШЫ

УСЛЕД ЗА ДЫМАМ

Юрка ГОЛУБ

Пра кветкі

*Кветкі. Жарсць. І блёкат.
Гоны і загоны.
Васількам — аблокі.
Дзьмухаўцам — адхоны.*

*У дрымотнай сельве,
Мабыць, кветка — прышчык.
Бліскча.
Блешча.
Хлышча.
Кветнік места Зэльва.*

*Цешыла дзяўчына
Прызбу.
Просьбу.
Прызму.
І былі прычыны
Для такой харызмы.*

*Дзе ў пялёстках крама,
Ці на хвалі лотаць,
Кветку не карайма —
Клікнем да палёту.*

*…Сэнс прыцьмелы кветак?
(Звернемся да назвы.)
Глянь, жыццё — не ветах.
Вабна. Непралазна.*

Даўно

*Стаяў старчма круты віхор.
Ляцелі іскры з-пад падэшваў.
Быў не жаданым недабор,
А перабор яго завершваў.*

*Гуляла шапка набакір
Ды не губляла раўнавагу.
Гаі гучалі, як клавір,
А ў бубен бухала адвага.*

*Ручай апоўначы не спаў,
І захлыналася прадвесне.
На ганку загрудкі хапаў
Свайго суперніка равеснік.*

*Сякера гахала з-за плеч:
Прасіла літасці калода.
Крышыў яе хлапечы меч,
Як крышыць дзень камлыгу лёду.*

*Нас нудны порсткімі назваў,
Маўляў, кідайце гульні… Досыць!
Ды як жа хочацца назад
Вярнуць памылкі маладосці.*

Вайсковыя фрагменты

*Калі гісторыю за фалды
Хапаў захоплены дзівак,
Дык атрымаў адказ кувалдай,
А тая з выведку падзяк.*

*Калі на фоне эскадрона
Круціў вусы, як зух, швейцар,
Дык думаў, што сядзіць на троне,
Адкуль нядаўна шуснуў цар.*

*Калі па ходніку цывільным
Ішоў з марозівам салдат,
Тады яму лагодна Вільня
Дарыла ўсмешку акурат.*

*Калі агонь жагнаў акопы,
А палітрук — «Вперед!» — гарлаў,
Дык захіліў сабой Еўропу
Аднак не грузны генерал.*

*Калі задуха касмадрома
Душыла воблакі і стэп,
Салдацік юны трызніў домам,
А свет круціўся, як вяртэп.*

*Пісака, маю перавагу:
Зашыцца ў поцемкі не гож.
У танку лёгка мець адвагу,
А паспрабуйце — басанож…*

Пахвалёнка калгасніку

*Наперад нёс узорны лёс.
Каб зоры на грудзях не згаснулі,
Дык клічнік стос праграмаў трос:
Любіў ён лозунгі з калёс,
Найболей — прагна і ўзасос! —
Любіў у поцемках калгасніка.*

*І бразгацелі рот і дрот:
Віват, шаноўнаму таварышу!
І браўся дрот у абарот —
У абарот наадварот —
Каб дакумекаць — дык запарышся.*

*Неверагодна! Але факт:
Сабе з калгаснага кубельчыка
І штат, і сват, і апарат,
Самтрэст, сампіт і самвыдат
Грунтоўна, бач — не напракат —
На сале жытку забяспечылі.*

*Ды вобзем бразнуўся калгас,
Бы ў дамавіну злегла класіка.
Не варухнуўся ласы клас.
Не заікнуўся, хто пагразу.
Цішком рыхтуе вестку час:
«Знайшлі, як маманта, калгасніка!»*

*Навошта пошук днём з агнём?
З Бераставіцы і да Мёршчыны
Такое смачнае загнём,
Што страсянецца зноў загон,
А Збаўца ўсхліпне над майном,
Яшчэ дарэшты не заморшчаны.*

*Яму, каб смаку паспытаць,
Недастаткова лашчыць зычныя.
На дзірах вунь страха, пята…
Даўно халодная пліта…
Адной уцехі: ёсць пятак —
Ён у калгасніка пазычаны.*

Прытча з ручаём

*Ручай згубіўся ў ценю стром,
Не даўся ў рукі спёкі, вёрткі.
Вось так накрылася хвастом
Вогнепаклонніца-вавёрка.*

*І згубу збегліся шукаць
Ганцы ўстрывожанага бору.
Сасны старэйшае шчака
Была пад колер каленкору.*

*А з верхатуры іншых дрэў
Абсягі мерыў крэч варонін.
І стала ясна: справа дрэнь —
Лёс ручая — хай Бог бароніць…*

*На вуснах рэчышча пагас
Апальнай лотаці гарлачык,
Бо неспрыяльным стаўся час,
Як дзень раз'юшана гарачы.*

*Ніхто не ўзгадваў пра выток,
Бо ўсе імкнуліся да вусця.
Між тым, ручай зрабіў віток
І да вытоку сам вярнуўся.*

Услед за дымам

*Нябітым шляхам сходзіць дым:
Сабраў даніну з галавешак.
За плечы кайстру кінуў. Дый
Памкнуўся ў далеч полем вешчым.*

*Халодны верад. Дзіды рос.
Капытны след па-за ірвамі.
І прывід капішча ўваскрос —
Нядрэмным вокам пазірае.*

*Паводка сцежак. Абярэг
Збярог над людскасцю апеку.
Яму — нішто — дзікунскі брэх,
Хоць сам падобны на калеку.*

*І раскатурханы палац,
І абыякавы гадзіннік
За часам мусяць паляваць,
А той сплывае, як ільдзіна.*

*Дзе глуха дыхае палын
І разарвала хмары ў клочча,
Гучыць трагедыя пілы,
Стаката буслава стукоча.*

*Ды не змарнела ўсё ж шана,
Не адарваная ад строяў.
Як таямнічая жаўна,
Або сасонніца на строме.*

*Вунь накрывае свята стол,
Дзе не кідаюць слоў на вецер.
Шпурляюць воклічы пад столь —
І дым каромыслам віецца!*

Сцежка, дзе зіма…

*Калодзеж. Сцежка, дзе зіма.
Снягір нагрэты начырвона.
Яму даніна — задарма
У перавагу над варонай.*

*У браняважы з лёду звон
Часова сцішыў камертоны.
Дзе лось прайшоў, як рабінзон,
У ствол залеглі два патроны.*

*Чакае печка мёрзлых дроў,
А цюцька ставіць на завею.
Калядных звычак і дароў
Нішто на свеце не заменіць.*

*Вятры быльнёг загналі ў сон,
І коўдра з інею пашыта.
Каб згадак варушыўся сойм,
Дзе нос прыплюснуты да шыбы.*

Назіранне над сюжэтам

*Знявага часу — не ілгаць!
У зморы шоры і маторы.
На даме мусіць палягаць
Сюжэт наступнага мінору.
Завязка: на мяжы пакут.
І смага зуб на прагу гострыць.
З герояў: першы — шалапут,
Другі — гастрольны Каліёстра.*

*А на кішэнных кірмашах
Кішыць разгневаны мурашнік.
Панадна аўтару змяшчаць
Свае задумы ў рукапашнай.*

*Знянацку ў дамы — інтарэс
Да Каліёстра страсна-востры,
А шалапут са смакам спрэс
Падлічыць рэбры Каліёстра.*

*Але і загадзя фінал
Галоўка ўсё ж не пралічыла:
Герояў аўтар даканаў…
Бо сам, няйначай, як лаўчыла.*

Стыхія

*У заплечча гахаў ураган
Сухазем'ю рэшткамі паселішч.
Хмары непрытомныя віселі.
Уздымала моры ў берагах.*

*Раздзімала храпы сатана.
Апраметнай зніклыя кляліся.
Асачыў качэўнік закулісся,
Ці стаіць у стэпе Астана.*

*А стыхію прагле супыніць
Маргіналы з шэрагам рэгалій.
Не схапіць за цуглі ураганы —
Бачыць можна толькі са спіны.*

АПАВЯДАННЕ

СТАРШАЯ МЕДСЯСТРА

(З ЦЫКЛА «ЖАР КАХАННЯ. АПАВЯДАННІ ПРА ЖАНЧЫН»)

Генрых ДАЛІДОВІЧ

...Ён і яна сустрэліся ў санаторыі. Яго туды паслалі падлячыцца, а яна там працавала старшай медсястрой.

Той даволі лагоднай зімою Сяргей раптоўна за кароткі час зведаў збег нечаканых выпадковасцей. У адзін заснежаны, з лёгкім марозікам, яшчэ без ліхтаровага святла надвячорак, замроены сваімі думамі, крочыў уздоўж свіслацкай набярэжнай дахаты. І вось прыцемак змяшаўся з успыхнутым, яшчэ няяркім святлом з лямпаў на бліскаватых слупах ды аддаленых акон жылых дамоў, і ў праёміне рачной бетоннай сценкі-адгародкі, дзе былі сходкі да ракі, ён спачатку пачуў гучны гоман, а потым убачыў траіх: юных двух хлапчын і дзяўчыну. Штурхаліся, ускіпвалі крыкамі, а да яго, Сяргея, як з неба звалілася нечаканасць у парыве дзяўчыны: «Дзядзечка, памажыце! Ратуйце ад наркаманаў!». Яму б непарушна абмінуць незнаёмую кампанію, але не дазволіла, як кажуць, шляхетнасць. Калі гукнуў, каб юнакі адступіліся, як палічыў, ад ахвяры, то крайні злева абсек яго зусім не па-шляхецку. Калі выкінуць «трохпавярховае», то на яго гаркнулі: такі-сякі, пайшоў прэч, пакуль жывы-здаровы!

Заўважылі: дастаў з кішэні курткі мабільнік. Зразумелі, куды і каму будзе званіць. Не паспеў яшчэ ўчуць з апарацікa, што яго слухаюць, як голагаловыя, з паўрасшпіленымі курткамі, з шаленствам у вачах хлопцы борздка выскачылі і абступілі яго: адзін кінуўся наперад, другі — за спіну. Уцячы не было як. Дый не чакаў ад нашмат маладзейшых бойкі, а слоўнай злосці. Памыліўся. Першы акулачыў па шыі. Калі з абурэннем хацеў павярнуцца да хулігана, то другі ўвішна ўдарыў нагой у жывот, ад чаго ён не мог не сагнуцца. А яны скарысталі гэта, пачалі бязлітасна лупцаваць, зганяючы на ім незразумелую яму сваю лютасць, а ён нават не здагадаўся кінуць долу партфель і таксама не цырымоніцца, не шкадаваць бэйбусаў. А калі займеў дзьве вольныя рукі і добра-такі тыцнуў аднаму ў пашчэнку, што той паляцеў з ног, то другі абрушыў яго так, што ён уцяліў правай скроняю на вызваленую ад снегу падвышаную над праходам бетонную акаймоўку.

Колькі ляжаў, не запомніў. Ад жанчыны, якая на вяровачцы прагульвала віславухага і лахматага спаніэля і раскатурхала яго, пачуў: непрытомнеў нямала. Яго шмат хто абыходзіў, лічачы, што валяецца п'яны (тых двух і дзяўчыну яна не прыкмеціла — значыць, усе збеглі), але, пабачыўшы, што аблеглы і скурчаны прыстойна апрануты, акрываўлены, рашыла памагчы. Пакуль ён, сапраўды, малацямны, жменяй снегу абтыцкваў кроў са скроні і шчакі, спагадная бабулька па мабільніку выклікала «Хуткую». Тая паблізу музея І з'езда РСДРП і падабрала яго, аслабелага і, галоўнае, паніклага тым, што яго збілі падшыванцы. У паліклініцы выявілі, што мае «лёгкае сатрасенне мозгу» — значыць, прыйшлося ўпершыню за свае трыццаць два гады зведаць бальніцу, дзе рану на галаве зацыравалі сям'ю радочкамі нітак...

«Во мардуленцыя! — гледзячы на бальнічным калідоры на яго выстрыжаную, памазаную зялёнкай лапінку на правым боку галавы, на заплылае вока з вялікай сіняй плямінай пад ім, ажно пацешылася іх любімая жоначка. — Рыцар! — А тады зняважліва: — Абэлтус! Ты моцны на розныя ілюзіі, на так званую духоўнасць, але не на кулакі! Знайшоў з кім счэплівацца! З наркаманамі!..

Канечне, жыццё даражэй за страчаныя хай сабе і дарагія вушанку, мабільнік, партфель з паўмесячным заробкам музейшчыка. А жонцы вельмі палесціла, што яе пазналі некаторыя ўрачы і медсёстры, папрасілі ў «вядомай спявачкі» аўтограф. Дык шчыра ці мо і для ўхвалы сабе за клопат пра мужа (з ім яна, «беларуская дзіва», размаўляе не толькі на «слэнзе», але і з тымі дадаткамі, якіх ён пазбягаў нават у гутарцы з калегамі-мужчынамі), схадзіла да самога галоўурача і папрасіла, каб «моего мужа, защищавшего честь женщины и за это избитого хулиганами», пасля лячэння паслалі ў санаторый-прафілакторый («цена путевки не имеет значения»). Ён, хутка набіраючыся здаровасці ды маючы нямала не толькі службовых турботаў, не хацеў ехаць, але яна настояла са сваёй у апошнія часы адкрытасцю: «Трэба прайсці курс далечвання, каб дурнем не стаў. Усё ж башку разбілі». — «А хіба я табе патрэбен і здаровы?» — «Не для цябе стараюся, а для дачкі. Толькі я сюды да цябе такога яе не пушчу: не трэба траўміраваць дзіця».

Вось яшчэ адна выпадковасць прывяла яго ў Н-і санаторый-прафілакторый, дзе раней у розных ваннах-басейне, лячэбна-працэдурных кабінетах бясплатна песціла сваё свяшчэннае здароўе эліта, а цяпер за аплату можна апынуцца там і простым смяротным.

...Яна зайшла ў іхнюю палату раніцай на другі дзень яго санаторнага жыцця-быцця, несучы для траіх пацыентаў градуснікі. Ёй недзе пад трыццаць, высакавата, нават з некаторай мажнасцю, але ўсё роўна стройная ў зялёных штанах, кашулі і нагалоўніку на светлых загорнутых у кружок валасах. Не красуня, але мілавідная. Яна, гэтая вабнасць, была не столькі ад поўных светларужаватых шчок і роўнага даўгаватага носа, колькі ад хараша пакатых плячэй, высакаватай шыі, блакітнаватых добрых, але прытомленых вачэй, паўнагрудзя і асабліва ад ярка выдзеленых — не, не ад памады, — паўнаватых поклічных вуснаў.

— Новенькі? — павітаўшыся і яму першаму з краю («старажылы» выбралі ложкі воддаль ад дзвярэй) падаючы градуснік, усміхнулася, і ён здзівіўся, як ад простай усмешкі яе вочы ажывіліся і ахарашылі твар.

<...>

Назаўтра яны павіталіся ўжо як знаёмыя. Але Сяргей палічыў за лепшае не пачынаць новай размовы. Дый не ведаў, пра што гаварыць, што яму трэба ад гэтай Тамары. А яна ягоную ўвагу мо прыйме за заляцанне. І адзін Бог знае, як яна, канечне, замужняя жанчына, паглядзіць на залёты выпадковага чалавека. Ды яшчэ тут, у санаторыі, дзе не такі ён адзін. Маладая і вабная жанчына заўсёды і ўсюды не застаецца без мужчынскіх фліртаў. Ды не ўсе паддаюцца на іх (праўда, прыкмеціў, не адна тут, на калідоры, у басейне і сталоўцы кідае на яго асаблівы позірк, не супраць загаварыць).

Праз некалькі дзён заўважыў: Тамара шукае вачыма ў мужчынскім гурце якраз яго, а пры сустрэчы калі не зусім вясёлае, то выпраменьваецца лагоднай усмешкаю. А яшчэ праз дзень, калі ў «ціхі час» стаяў у калідоры каля акна і пазіраў на двор, дзе нечакана завіхурыла мяцеліца і зноў забяліла падчарнелы ужо сакавіцкі снег, яна падышла.

— Усё-такі не спіцца? — пажартавала.

— Не. А калі пабачыў вас, то хочацца прачытаць вам прысвечаны верш.

— Мне?

— Асабіста вам.

Ідзі! Не марудзь, ідзі!
Іначай нельга ў жыцці.
Ідзі, белахалатая.
Ідзі да іх, да людзей,
Ідзі з палаты ў палату —
Суцеш, супакой, абнадзей.
Ідзі і цяплом адорвай.
Ідзі, бо патрэбна ты...
Не ўсе хочуць быць добрымі,
Ды хочуць дабраты.

— Вы — паэт?

— Пішу і вершы, — сказаў без аніякай пахвальбы. — І мог бы мець нават сваю кніжку. Цяпер можна выдаць амаль усё, абы грошы. Мо і выдамся калі. А чуты верш называецца «Белахалатая», і напісаў яго мой знаёмы паэт Анатоль Вярцінскі. Мабыць, у бальніцы. Праўда, вы ў зялёным халаце.

— У нас белыя халаты носіць белая косць, — відочна была настроеная на размову. — Мы, чэлядзь, носім зялёныя. Альбо іншага колеру. Тое, што дадуць. Праўда, і я апранаю белы, калі прымаю хворых.

— Тамара, выбачайце, канечне. Але мне здаецца: вы нечым прыгнечаная...

— Чаму вы так думаеце?

— Вы, бывае, так сказаць, звычайная, — сказаў і адразу ж спахапіўся, што вырвалася не тое. Ды не вернеш прамоўленае ўголас. — Калі ў вас лёгка на душы і вы звычайна ўсміхаецеся, тады на вачах расцвітаеце. А калі вас апаноўвае нейкая горасць, вы маркоціцеся...

Яна слухала і пазірала на яго пільна і засяроджана.

— Вы хто — псіхолаг?

— Не. Працую ў літаратурным музеі. Адшукваю ў сем'ях памерлых пісьменнікаў рукапісы, пішу юбілейныя і звычайныя артыкулы, ладжу літаратурныя вечары, чытаю лекцыі. Нават невялікі начальнік. Загадчык аддзела.

— Ясна, — прамовіла. І тут жа ўжо з эмоцыяй. Ды з халаднаватай: — Вы — тут наш пацыент. Для таго, каб падлячыцца. Дык ці варта вам стамляцца разгадкамі пра душэўны стан медперсаналу? І ці кожны з яго зажадае дзяліцца з пацыентам сваім, асабістым?

Што ні кажы, пстрыкнула яму па носе!

— Выбачайце, — зноў папрасіў. — Я зусім не хацеў сапсаваць вам настрой. Вы мне неабыякавая...

— Ясна, — паўтарыла. І далей нечакана строга, ушчувальна: — Ці не падаеце намёк на санаторны раман? Ведайце: у нас гэта забаронена... — Пабольшыла вочы, пахітала галавою: — Вось так, паэт...

Павярнулася і пайшла. Пасля гэтага пры сустрэчы віталіся, але яна не мела намеру для гаворкі, апускала вочы і адыходзілася. Цяпер — мо толькі ў іхнюю палату? — і градуснікі пачалі прыносіць іншыя. А ён не ведаў, што рабіць. Апраўдвацца? У чым і як? Не заўважаць яе?..

Пагоршыўся сон і ўночы. Ён, як раней міла жартавала, а цяпер злосна кпіла жонка, — «стараэжымнік» — значыць, найперш прыільнік моцнай сям'і. Спачатку так у іх усё і складвалася, калі яна была радая патрапіць хоць у малавядомы, дык і малаграшовы ансамбль, калі з прыватнай кватэры перайшла ў яго двухпакаёўку (яе яму запісала ў наказе цётка), калі была заадно ў тым, што цяпер грэбліва называе «так званай духоўнасцю». Ён радаваўся, што падарыла дачку. Па яго просьбе адзін ужо вядомы кампазітар, часты госць музея, памог ёй выбіцца на сцэну. І спачатку паводзілася там сціпла, у многіх рэпетыцыях, у стоме, прыдзіркаx кіраўніка ансамбля, кампазітараў старалася не занядбаць і яго з дзіцем. А потым... Асаблівa тады, калі патрапіла ў сіло розных модных і багатых шоўмэнаў ды менэджэраў, якія вучылі яе найперш заваблівaць слухачоў, а пасля і тэлегледачоў не столькі голасам (ён у яе не лепшы, але і не горшы, чым у многіх іншых), колькі маладым, стройным целам. Для гэтага ёй зноў, але па-новаму ўжо прыйшлося пацярпець — на аперацыях, калі ёй павялічвалі грудзі (не грудзі сталі, а гарбузы), выпраўлялі нос і губы. І пачаліся ў іх спрэчкі, калі ўцягнулася да «папсы» і заяўлялася перад людзьмі і камерай паўголай. «Каму трэба твая вясковая сціпласць?» — абуралася на яго дакоры. — Яна — доля няўдачнікаў. Для сваёй нішы, для вялікіх мані-мані нам, эстрадзе, трэба папулярнасць. А вядомасць — адметнасць, выклік, нават скандалы». — «Скандаламі можна дабіцца папулярнасці, але не вядомасці. Яна, вядомасць, а за ёю слава, легендарнасць — штосьці больш значнае і даўгавечнае». — «Даўгавечнае-даўгавечнае!» — Перадражніла. — Мне цяпер патрэбныя лаўры!» — «Шум? Пена?» — «Хай сабе і гэта. Абы гучала маё імя. Абы сёння, заўтра вытрымаць канкурэнцыю, быць у фаворы».

І трэба сказаць, у сваім намысле ці па нечыяй падказцы правілася не проста летуценнасць, а халодны разлік. Паволі выбілася са шматлікасці такіх, як сама, пачала заяўляцца побач з мінскімі зоркамі. Затым — гастролі, запросіны на закрытыя забавы багацеяў; таксама дабілася, як і той-сёй, займець на тэлебачанні сваю праграму — вучыла, як рабіць розныя прысмакі (хоць дома даўно ўжо не кухарыла і не пральнічала; ён глядзеў сам сябе; дачку апошнім часам найбольш гадавала цешча, якая пайшла на пенсію, каб паспрыяць даччынай «кар'еры»), здымалася ў самай рознай рэкламе. Стамлялася, стала нярвовай, часамі нават істэрычнай, але не адступалася ад свайго. «Нам трэба свяцціцца і свяцціца, інячай — канцы, выплывуць іншыя. А за гэтым — забыццё, галеча». Калі зрэдку сустракаўся з яе калегамі ў адной кампаніі, то не мог не жахнуцца: колькі ў іх сама- і славалюбства, пагарды, непрыязні да іншых! У іх гавэнда пра адно і тое ж. Хто і праз што выбіўся, хто з кім «займаецца сэксам», жэніцца-перажэньваецца, хто п'яніца, наркаман альбо «блакітны»... Многія кампазітары, спевакі сядома пазбягалі знацца з вершамі беларускіх паэтаў, гналіся за рускамоўнымі, каб лягчэй «выбіцца». Некаторыя, марачы пра славу і вялізныя заробкі маскоўскіх эстрадных «прымадоннаў», «імператрыц», «каралёў», «залатых галасоў Расіі», рванулі ў Маскву, але там ім падставілі падножку, на іхнюю думку, «акулы шоў-бізнэсу», ды ім, «нацыяналам», перабеглі дарогу вядомая латышка, некалькі грузінскіх эстраднікаў і асабліва ўкраінскія «папялушкі». А якія былі хітрыкі, змовы, выкрунтасы, подкупы, каб патрапіць на песенны конкурс Еўрабачання! Звадамі, скаргамі пакрыўджаных займаўся нават Ён, нібы ў яго было зашмат вольнага часу і не меласця іншых, больш важных турботаў...

Праўда, ва ўсім гэтым пакуль што была адна жанчына перавага: не з яго, а з яе заробкаў перабраліся ў чатырохпакаёўку, набылі «прэстыжны» легкавік, гараж, маглі марыць аб «прэстыжным» загарадным катэджы. Пакуль што Святлана набыла толькі двухпакаёўку ў горадзе. І ўпотай ад яго, зрабіўшы гаспадаром свайго бацьку. Значыць, ён, муж, у выпадку чаго не будзе мець права на тую маёмасць...

...На трэці альбо чацвёрты дзень у «ціхі час» у іхнюю пала-

ту зайшла маладая медсястра і запынілася каля яго.

— Вы — Сяргей Адамавіч?

— Я.

— Вы не будзеце спаць?

— Не.

— Тады старшая медсястра запрашае вас на намечаныя працэдуры.

Не юнак, а захваляваўся. Ніякае лячэнне яму не было прапісана ў Тамарыным кабінеце — значыць, яна кліча яго на размову. Але якая будзе гаворка? Пра што?

Каб не ўчыняць шуму, зайшоў без стуку. Седзячы за сталом у белым халаце (а як жа, прыём!), гаспадыня акінула яго не маркотным і не строгім, а ўважліва-вывучальным позіркам. І ў гэтай уважлівасці было штосьці новае. Здаецца, даверлівае.

— Вы пазбягаеце мяне, — калі ён сеў і апусціў галаву, пазіраючы толькі на тое, што стаяла і ляжала на яе стале, загадкава прамовіла яна.

— Яшчэ раз выбачайце, — прыклаў руку да грудзіны і падняў галаву: вочы яе былі засяроджаныя на ім, быццам хацела зазірнуць у ягоную душу. — Што праўда, то праўда: я тады быў нетактоўны.

Замаўчала. І цяпер, здаецца, яе позірк быў ужо далёкі, паўз яго.

— Не, гэта вы мне выбачайце, — ціха сказала. — Нетактоўная была я... Вы глыбока спазналі стан маёй душы... І я не знайшла нічога лепшага, як гаварыць вам рэзкае...

Цяпер замоўк ён.

— Усё з-за свайго...

Калі жанчына закранае сваё сама балючае, то трэба ўмець яе паслухаць.

— Быў чалавек як чалавек. Журналіст. Пісаў смела, часамі рэзка. Часта друкаваўся, начальства яго цаніла, паставіла загадчыкам аддзела. Няблага зарабляў. Ад газеты нам і кватэру далі. Але потым яго не толькі рэзкасць, але і смеласць не спатрэбіліся. Ад яго пачалі патрабаваць ухвальнага, падаючы за ўзор «Советскую Белоруссию». Ён не паддаваўся, хацеў «вялікай журналістыкі». А значыць, трапіў у лік падазроных, «нячэсных». Яго перасталі друкаваць, а пасля як «неадпаведнага сучаснасці, значнасці» перавялі ў радавыя супрацоўнікі-рэдактары. Усё больш і больш заліваў сваю асечку, а то і зрыў гарэлкаю. Калі быў п'яны, то хадзіў сварыцца да галоўнага: «Вы прадалі ганаровае званне журналіста!». «Бяздарнасці!». «Прыстасаванцы!». Цярпелі-цярпелі за яго былыя заслугі, а затым звольнілі. Ды адкуль яго потым толькі не звальнялі! Нават доўга не патрымалі дворнікам. Я спачатку спачувала яму, прасіла хоць не траціць чалавечую годнасць, пачакаць лепшых часоў. Але дарма. Спіўся. Адна ў яго турбота: выпіць! Абы чаго! Рэчы з кватэры зносіць... Канечне, нічога добрага паміж намі не можа быць. Які ўжо час мы як чужыя людзі. Ён па сабе і я па сабе. А на днях падала на развод. Вось і перажывала. А некалі любіла, ганарылася... Сама цяпер не ведаю, чаму так напала на вас. Нават за тое, што... Ну, за ваш камплімент...

— Каб жа я ведаў пра гэты ваш стан! — пакаяўся.

— Вам не трэба каяцца, — супакоіла. — Якраз вы паводзіліся тактоўна. Не ў прыклад іншым, якім адно толькі трэба...

— Тады на ваш давер адкажу і я сваім даверам, Тамара. Я таксама паўхаласцяк.

Ад ледзь прыкметнай усмешкі варухнуліся яе поклічныя вусны:

— Як гэта зразумець? Паўхаласцяк?

— Я жанаты, але, лічы, не жыву з жонкай, — на яе прызнанне адказаў сваім. — Яна — эстрадная спявачка, — назваў яе імя і прозвішча, ад чаго ў Тамары прыўзняліся бровы. — І ў яе новы бойфрэнд. Дык хіба цярпець гэта бясконца, быць пасмешным?

— Вось што... — паспачувала. — Але па вас не відаць, што вы перажываеце. Значыць, умееце добра хаваць свае нягоды.

— А я, Тамара, перажыў ужо ўсё. Вярнуся адгэтуль і, як вы, падаю на развод.

— Дзеці ёсць?

— Дачка.

— І ў мяне дачушка.

— Вам то не пакінуць, а вось мне — наўрад ці. Найперш цешча не саступіць.

— Значыць, Сяргей, мы з вамі... — Пахітала галавою. — Пабрацімы ці што...

— Выходзіць, — адказаў. — Хоць...

Напружылася.

— Мо і не выпадковая наша сустрэча. Дарэчы, дзе вы жывяце? У гэтым пасёлку?

— Не, у Мінску. Сюды езджу аўтобусам або маршруткай. Бывае, начую тут. У дзяжурства. А то і каб п'янюгу не бачыць.

— Тады давайце памяняемся тэлефоннымі нумарамі, — шчыра папрасіў, паклаў сваю далонь на яе руку. Тамара рукі не забрала. — Як кажа адзін мой знаёмы: «а ряптам?..».

— Чаму не, — паціснула плячыма, — можна.

— Паслязаўтра, Тамара, я ад'язджаю.

— Ведаю, — усміхнулася. І хітравата: — Як і тое, што вы па бацьку Адамавіч.

— Значыць, заўтра ў нас тут развітальны дзень.

— Значыць... Праўда, я мо і не буду тут.

Ён сціснуў яе руку, а пасля павярнуў тую так, каб іхнія далоні былі адна да адной; Тамара адказала непарушнасцю, а неўзабаве паддалася, і іхнія пальцы самі па сабе спляліся, ад чаго ў Сяргея пыхнула цяплынь у падушачках далоні і пацякла-паплыла па ўсім целе, а Тамара ўздрыгнула, прыплюшчыла вочы і дробненька затрымцела вуснамі. Ды калі ён ужо асмялела прыпадняўся, каб пацалаваць іх, дык не страціла пільнасці, вольнай рукой не дапусціла блізка:

— Ну-ну!.. Давайце мяняцца тэлефонамі.

...Назаўтра ён быў прыемна ўражаны і ўсхваляваны: вяртаючыся з вячэрняй прагулянкі на свежым паветры, на сваім калідоры, каля стала дзяжурнай сярод некалькіх медсёстраў убачыў і Тамару. Яна размаўляла з калегамі і знарочыста гучна, мо каб адолець хваляванне, падвясельвалася і раз-пораз азіралася іменна на ўваход з пляцоўкі ад ліфта. Вось позіркі іх сустрэліся — яна не запыніла ўсмешкі, толькі ў яе вачах разам з радасным бляскам цяпер мільганула адценне ніякаватасці, а то і сарамлівасці. Падышоўшы браць у апошні раз прапісанае яму лякарства, ён марудзіў, каб перш зрабілі гэта іншыя, а каб яму паболей застацца тут. Яна цяпер, здаецца, не пазірала на яго, прадаўжала маладзіцца, весці пачатую бяседу са сваімі калегамі, але як толькі ўзяў загорнутыя ў папяровую сурвэтку таблеткі, адразу ж павярнулася і па-змоўніцку плюснула вачыма і паказала позіркам на калідор: ідзі да сябе. І рушыла першая. Ён хутка яе дагнаў.

— Дзякуй, — сказаў па-маладому ўзбуджана.

— Адна медсястра папрасіла падмяніць, — спакойна патлумачыла.

— Дык вы будзеце тут, на пасту?

— Не, у сваім кабінеце.

— Калі мне прыйсці да вас?

Яна быццам не зважала на гэты яго зусім не двухсэнсоўны запыт, паварочвала галаву то ў адзін, то ў другі бок, з некім віталася, да кагосьці загаворвала, а пасля ўлучыла хвіліну і яшчэ больш захвалявала паўшэптам:

— Пасля адбою. На калідоры будзе адна дзяжурная. Мая лепшая сяброўка...

«Адбой». Ён спазнаў, што гэта такое тут. Ёсць падпісаны галоўурачом распарадак, ён надрукаваны і вывешаны на дошцы аб'яў, але мала калі яго шануюць. Хворыя хоць і хворыя, але ж жывыя людзі, нямала з іх такіх, якія не толькі глядзяць, але ўжываюцца ў вячэрнія даўжэзныя серыялы, таму сядзяць у холе каля тэлевізара доўга. Каб іх вярнуць у палаты, бывае, пстрыкаюць святлом — выключаюць-уключаюць: адбой. Ды людзі просяць дазволіць даглядзець. Як адмовіш тым, хто незадаволена сыйдзе, але пасля ім стане горш? Дык вось яму прыйдзецца чакаць яшчэ не адну гадзіну таго адбою.

Яго аднапалатнікі, інфарктнік і інсультнік, таксама пачыльгікалі ў хол, куды ён мала зазіраў, каб марна не траціць час і не задавольвацца тым эфірным словаблуддзем, чым нацешваюцца ці суцешваюцца іншыя. Спрабаваў чытаць... Раз-пораз пазіраў на гадзіннік на руцэ: стрэлкі паўзлі вельмі марудна.

Па тым, у які час звычайна шумнавата разыходзяцца гледачы, Сяргей урэшце дачакаўся: хвілін дзесяць да гэтага. Лічачы, што цяпер ніхто не пазважае на яго, не вытрываў, падхапіўся і, папраўдзе нікім не заўважаны, рушыў да запаветнага кабінета, што быў непадалёку дзяжурнай. Турзнуў за чорную ручку замка — замкнёна. Яшчэ раз-другі паўтарыўся — тое ж. Зноў настойліва — урэшце шчоўк, дзверы прачыненыя (адразу кінулася ў вочы, што там няма святла), ён — туды. Тамара — збоку, пры вушаку. І пры тым дасветку, што падаў з-за акон, было відаць: яна цяпер не ў бальнічным халаце, а ў чорнай спадніцы крыху вышэй калень і ў белай, туга напятай на поўных грудзях блузцы, а на спіне рассыпаныя доўгія светлыя валасы. Яго сустракае не медсястра, а Жанчына! Не зусім вядомая яму — зрэшты і няхай! — але ўпадабаная маладзіца!

Яна прыхілілася спіной да сцяны і моўчкі стаяла.

Ён ужо ўпэўнена раней заўважаны тут ярлычок на дзвярах павярнуў убок, шчоўкнуў на замыканне. Абняў яе, прыціснуўся. Яна не варухнулася. Але калі памкнуўся да яе вуснаў, адвяла іх:

— Сяргей, ну... Як лепш сказаць... Не трэба лічыць, што калі я прыйшла, то... Хоць мне хацелася пабачыць вас іменна сёння...

— Я не магу інакш.

— Давайце пасядзім, вып'ем кавы, пагаворым.

— Гаварыць могуць рукі і вусны. Мае — дык вельмі.

— Пашкадуйце, — папрасіла, але не адхілялася.

— А што значыць — пашкадаваць маладую, прыгожую, палюбленую і жаданую жанчыну?

— Гэта — прызнанне ці...

— Не «ці», а самае што ні ёсць шчырае прызнанне, — перапыніў. — Цяпер толькі магу паўтарыць тое, што напісаў наш Купала: «Нядаўна з табою мне спаткацца прыйшлося...». І гэтае спатканне падняло, узнесла маю спакутаваную душу.

— Паэт ёсць паэт, — пасміхнулася.

— І чалавек. Таму прашу: давай пярройдзем на ты і пачнем цалкам давяраць адно аднаму.

Загарэзіла:

— Наша сустрэча такая лёсаносная?

— Безумоўна. У кахання свае законы. Як і ў цябе, так і ў мяне яно яшчэ няспраўджанае. А яно хоча ажыць. І не толькі ў словах. «І слухаць нічога ўжо больш не жадаю, А толькі хачу цалаваць, цалаваць...» — пісаў пра такое Адам Міцкевіч (пераклад Міколы Аўрамчыка)...

Абгарнуў яе шчокі, скроні далонямі і прыпаў да яе вуснаў. На гэты раз яна саступіла. Нават у доўгім, але пакуль што не жарскім пацалунку. Толькі ўздрыгнула: за блізкім прытульваннем, пацалункам адчула і яго ўзбуджаную мужчынскую сілу. Канечне, ведала, што за гэтым бывае: яна, жанчына, можа быць супраць таго далейшага, але зусім ужо блізкага, а ён, мужчына, будзе настойлівы.

Адхіліла вусны і з перарывістым дыханнем:

— Мы зайшлі ўжо далёка...

— Але можам быць зусім блізка. І прашу: не аддаляйся. Сам лёс яднае нас.

Зноў пацалунак, за ім — усё большае змаганне рук; у твар хлынае гарачыня; доўгі пацалунак закружвае галаву; яна адкідвае яго рукі, але ўсё ж застаецца без спаднічкі, у расшпіленай блузцы, а ўрэшце і зусім без адзення. Цяжка, на ўсю душу, уздыхае.

— Пачакай, — кажа яшчэ з развагаю, нібы п'яная ідзе да шафкі, дастае коўдрачку, сцеле яе на падлозе, а паверсе белае прасцірадла, апускае падушачку, кладзецца сама і, заварожваючы яго хараством бела-матавага багатага цела, асабліва поўнымі клубамі і грудзямі, закрывае далоняй вочы.

Ён, сямейнік, не першы раз бывае блізкі з жанчынай, але цяпер — незнаёма па-новаму і ўзбуджана. Яны, з хваляваннем спазнаючыся, абое трымцяць, нібы аглушана пазбаўляюцца і мыслення, і ўсякіх слоў, яднаюцца ў адно, а пасля жарска даюць-бяруць тое непаўторнае, чым можа ашчасліваць маці-прырода...

...Пазней, калі ўжо сядзелі на кушэтцы і пераадольвалі пачуццё нейкай адметнай віны, Тамара падала голас першая і як бы з іроніяй:

— А цяпер кахаеш?

— Цяпер ты мне ўжо дарагая.

— Што ж... Але калі пакінеш сцены гэтай бальніцы і пастараешся забыць нейкую легкадумную медсястру, то дакараць не буду. Я таксама не святая... Вагалася, але прыйшла ж, упусціла цябе сюды...

— Я не пакрыўджу цябе, Тамара, — прытуліў яе ён. Не сакрэт, не заўсёды мужчыны шчодрыя на такія словы, якіх чакае жанчына пасля блізкасці, і калі яна можа дакараць сябе, што паспяшалася саступіць. Калі жадае ўжо іншай пяшчоты...

...Сяргей скасаваў шлюб са Святланай (некалькі газет напісала пра гэта са смакам; некаторыя з вялікай хлуснёй і бессаромна выдуманым папрокам яму: дэспат, тыран, не толькі не разумее «высокае мастацтва», але і груба глуміў тонкую душу спявачкі, нават «прымяняў фізічную сілу»), Тамара — са сваім. Сустракаліся з год па-халасцяцку, а пасля Тамара перабралася ў яго купленую былой жонкай двухпакаёўку (чатырохпакаёвік застаўся ёй). Пажаніліся. А яшчэ праз год Тамара ашчаслівіла яго сынам.

2005, 2010

ВЕРШЫ

ПАЭТЫ-ПЕРАМОЖЦЫ

Макс ШЧУР

* * *

Праз няведанне іншых мудрот,
у адказ на прынятыя санкцыі
дождж наклікаў на Прагу смурод
берасцейскай чыгуначнай станцыі.

І раптоўна распаўся асфальт
на ўгнанення авечага атамы,
і адчулі мінулага гвалт
над сапраўднасцю ніякавата мы —

нават купалу рымскі авал
з мінівежай-цвічком замест клапана
рукамыйнік цяпер удаваў,
і малітва ўгару з яго капала —

я калісь карыстаўся такім,
у дзяцінстве, на ўскраіне Берасця...
Падбярэце праўдзівейшы Рым,
калі гэтаму вершу не верыце.

* * *

У шынку, дзе французская мова на слых
ператвараецца ў беларускую,
я сяджу між інтэлектуальных малых
і паэзію, як крыжаванку, лузгаю.

На паўкулях жаночых экватар майткоў
увагі маёй зусім не прыцягвае —
гэта ў голаў каштанаў ударыла кроў
і эрэкцыю кветак робіць працяглаю.

Цыгарэта не можа напіцца агню
ад залішне слабой, недалужнае свечачкі —
неяк так я сябе спадзяваннем маню,
што мяне не цікавіць нішто, апроч вечнасці.

* * *

Я б хацеў, каб на Страшным судзе
гонар мой бараніла кіска —
пра мяне як пра гуманіста
лепш ніхто не апавядзе.

* * *

У ціхай вёсцы спіцца ўдзень, бы ў інтэрнаце,
што застаецца на вакацыі пустым.
Самота: мой прыватны ордэн Цынцынаці.
Скажу астатнім, што «падцягваю хвасты».

Ды насамрэч хачу пажыць, як ганаровы
прафесар, госць... Сфальшую сам сабе залік.
Я курс зямны прайшоў хіба што да паловы,
а ўжо экзамен выніковы заваліў.

Аднак ляную ісці на пераздачу —
мне не патрэбны анічый ужо дыплом,
я лепш пасплю — прынамсі ў сне цябе
пабачу,
далёкі менскі інтэрнат, мой родны дом.

* * *

З вагону ў вагон, праз жыццё, нібы праз
цягнік —
у трэцім утульней, чымся было
ў папярэднім.
Шкадуеш толькі, што той незваротна
знік —
але не часцей, чым раз на дзень, у сярэднім,
калі рассякае падушкі рука-плыўнік.

У кожным з вокнаў — прызвычны
сюррэалізм,
Раз-пораз кандуктар прыцісне адно
да сценкі.
Лятуць у паветры кулі ў вобразе клізм.
Усё цяжэй слухаць з рэйкаў чужыя енкі,
чакаць катастрофы — а прыйдзе зноў
катаклізм.

Куды ты лезеш? Хіба ў вагон-рэстаран?
Занятую прыбіральню? Да машыніста?
Паведамляюць: цягнік ідзе на таран.
Табе раптоўна лягчэй: усё заібіста,
і хочацца болей прайсці разы ў паўтара.

Птушкі

Тані Скарынкінай

Паўлін: зялёная хваля хрыбта
ападае хвастом, заліваючы зрок і зямлю.

Маўчанне пугачоў за мурам змушае паўлінаў
да перадсмяротных крыкаў.

Галубы стракочуць, нібы механізм
прымітыўнага жалезнага дзіцячага
пісталета.

Ластаўкі лунаюць над галавой,
не зніжаючыся да драпежніцтва.

Чайкі пралятаюць святлом пражэктара
ў непарушнай канфігурацыі,
нібы адмысловае сузор'е,
паскараючы бег начы.

* * *

Якая розніца, дзе жыць!
Паўсюль гавораць па-расейску.
Не, не ўцячэш ты, вечны Жыд,
з табе прысуджанага Менску.

Па ружах кроч ці па лязу,
у свет упервай зрок лупаты —
так ці інчай павязуць
у вёску з назвай Курапаты.

* * *

Найлепей спалася на дзедавай падушцы
(бо ў школу раніцай не клікала трывога),
альбо на менскай інтэрнацкай раскладушцы
ў святле зялёных лічбаў радыё старога,

альбо ў чужых людзей пасля бадзяння
ў скверы,
на невідочнае з сусвету ціхай выспе —
калі жыццё ёсць толькі сон, то дайце веры:
я жыў так глыбака, што нават
неспач высніў.

Купала

Не аб падлогу ўдарыўся — аб мур,
якому ўсцяж няма канца і краю.
Прычына — гонар, п'янства ці амур —
якая, зрэшты, розніца, якая?

Нібыта целу ўжо не ўсё адно —
яно, як аказалася, не з бронзы.
Не так і доўга пражыло яно,
хоць прычакала славы незайздроснай.

Што меў — пакінуў у руках чужых,
народу стаў нялюбым бацькам Лірам.
З гатэлю выпісаўся, і цяпер ляжыш
ля ботаў следчых зрынутым кумірам.

Дух быць маніўся песні ўладаром —
такой, якой гісторыя хацела.
Ён выканаў замову. На паром
у небыццё пагружанае цела.

Слых у гісторыі не гэтакі й благі,
ды памяць — карацейшая за розум...
Спазнаць цяжар уласнае вагі
магчыма толькі грымнуўшыся вобзем.

Зранку

Трамваі звоняць у акно,
турысты ў дзверы.
Мяшае раніца ў адно
зялёны й шэры.

Паўтор заменяць на паўтор
у тэлескрыні.
Напаў-будзільнік, напаў-Тор
у вуху грымне.

Пралічаным кунг-фу-штуршком,
нібыта елку,
з грыбніц па дах асветляць дом,
глушыцель енку.

Ад пляшкі выпітае шкла
ўгары аскепкі
збярэ сляза, як і знайшла
вячор — услепкі.

* * *

Раней у нудзе абыходзіў пакоі
сяброў інтэрнацкія,
цяпер абыходжу наяўныя ў наваколлі
бары і рэстарацыі —

і ў самых далёкіх вісяць фатаграфіі
экзатычнага тут гістарычнага цэнтру:
пазнаць, што я адтуль, вы б патрапілі
паводле звычак, бы паводле акцэнту.

* * *

Я згадаў пра дзедава паліто,
што ўначы вісела на печы ў спальні,
і я, маленькі, прасіў бабулю
прыбраць яго, бо трымцеў ад боязі,
што гэта — прывід (дзед спаў у залі).

Калі раней мы нечага праглі, то
пазней гэта бачыцца недаравальным.

Здаецца, цану б заплаціў любую
за сустрэчу з прывідам, богу тоесным,
з якім мы столькі недаказалі.

* * *

Я жыццю абвяшчаю асабісты страйк
у чаканні заслужанага падвышэння.
Не, мяне не турбуе звальнення страх,
і не быць дабрабыту маёй мішэнню.

Я ўступаць не збіраюся ў прафсаюз
дзеля дзіўнага шчасця быць раўнапраўным —
там адно індульгенцыі прадаюць,
а не рай, дый з подпісам несапраўдным.

* * *

Паэты-пераможцы
не чулі пра ўласную перамогу.
Як смяяліся з ворагаў, так і смяюцца.
Як нідзе й ні на кога не працавалі,
так і не працуюць.
Нават выглядаюць молада, па-старому.
Вакол іх па-ранейшаму збіраюцца падлеткі,
у якіх яны пазнаюць саміх сябе,
пагатоў што некаторым з іх даводзяцца
бацькамі.
Паэтам кажуць, што гэта яны
«заснавалі падмуркі»,
але ім здаецца, што яны іх заўжды
разбуралі.
Некаторыя называюць іх у вочы
«жывымі класікамі» —
паэты толькі ўсміхаюцца, бо ведаюць,
што гэта няпраўда.
Класікі жывымі не бываюць, а паэты
— яшчэ жывыя.
Яны такія ж, як і ўсе, хіба крышку
болей таленавітыя,
ды можа яшчэ шанцавітыя.
І няхай гэта прагучыць як ерась,
але, гледзячы на іх, здаецца,
што бог усё-ткі па-свойму любіць
добрых старых паэтаў.

* * *

Фейерверкавы сезон
палявання на анёлаў
адкрываецца лязом,
быццам новы парасон
пакрывае храму голаў.

(Я б страляў стральцоў-назолаў.)

На вясельным караблі,
бы фігуркі на падстаўцы,
танчаць (ф)ракі й матылі,
танчаць бабы й бабылі,
мод — і так — заканадаўцы.

(Як адзін — прадаўцы Збаўцы.)

Побач з гэтым караблём
на байдарцы (ці каноэ)
ў бубен лупіць нейкі гном,
нібы ў Брэсце — метраном,
што палохае вайною.

(Чуеш, дурань, кінь дурное.)

Хоць ты гэты параплаў,
не з філосафамі баржу,
на сякеры пераплаў,
каб метал не прападаў!
Плюнуў б з моста — ды прамажу...

(Тут канец рачнога шаржу.)

* * *

Там, дзе мая паэзія — там Люнд,
бляск літар у начы сярэднявечча,
дзе ранак пераходзіць проста ў вечар,
не даўшы разгарнуцца шыхтам дню.

Там, дзе мая паэзія — Стакгольм,
закрытыя, нібы кварталы, строфы,
свабода на памежжы катастрофы,
святога Эльма прывідны агонь.

Там, дзе мая паэзія — там Менск,
у невядомае штоночны шпацыр,
адсутнасць перспектыў, кахання, працы...
Крыві і амбры жудасны замес.

* * *

Хто вясны хоча зараз, тут жа —
забываецца, што яе
заслужыць яшчэ трэба ў сцюжы,
што вясну толькі той заслужыць,
хто па ёй, як па снезе, тужыць
і чакаць не перастае.

АПАВЯДАННЕ

РАЗ НА ТЫДЗЕНЬ — НЕ СМЯРОТНА

Пабачыў сецiўны свет адзінаццаты нумар электроннага часопіса «ПрайдзіСвет» «Бітнікі шыбаў», прысвечаны літаратурнай контр-культуры сярэдзіны XX стагоддзя. Сярод гучных імёнаў нумара — прадстаўнікі Біт-пакалення: Джэк Керуак, Ален Гінзберг, Грэгары Корса, Генры Мілер, Кен Кізі, Рычард Бротыган, блізкія да іх па духу Курт Вонэгут, Чарлз Букоўскі, Джэром Дэвід Сэлінджэр, француз Серж Гензбур, расіец Венядзікт Ерафееў, украінец Сяргій Жадан.

«Літаратурная Беларусь» традыцыйна прапануе ўвазе чытачоў публікацыі з новага «ПрайдзіСвета» — і выказвае ўдзячнасць яго рэдкалегіі.

Джэром Дэвід СЭЛІНДЖЭР
(1919 — 2010)



Ён трымаў цыгарэту ў роце, пакуль пакаваў рэчы, і жмурыўся, каб дым не трапляў у вочы, таму па твары немагчыма было зразумець, сумны ён, спалоханы, разлаваны ці ўжо проста абыякавы. Маладая жанчына сядзела ў вялікім фатэлі, як госця, на яе твар падаў прамень ранішняга сонечнага святла, і прыгажосці яе гэта не псавала. А найлепшымі былі, бадай, рукі — загарэлыя, поўныя, прыгожыя.

— Мілы, — гаварыла яна, — я сапраўды не разумею, чаму ўсё гэта не мог зрабіць Білі. Ну, то бок я...

— Што? — спытаў малады чалавек. У яго быў хрыплы голас заўзятага курца.

— Ну, я не разумею, чаму гэта не мог зрабіць Білі.

— Ён занадта стары. Уключы мо радыё. Цяпер могуць даваць някепскую музыку. Паспрабуй хвалю тысяча дзесяць.

Жанчына выцягнула назад руку з залатым заручальным пярсцёнкам, побач з якім блішчэў на мезенцы фантастычны смарагд, адсунула белыя створкі, штосьці націснула, штосьці павярнула. Потым адкінулася ў фатэлі і пачала чакаць, але раптам без дай прычыны пазяхнула. Малады чалавек паглядзеў на яе.

— Што за *жахлівы* час, каб ехаць, — сказала яна.

— Я ім перадам, — адказаў малады чалавек, перабіраючы стос насовак, — што мая жонка лічыць такі час жахлівым, каб ехаць.

— *Думаю,* мілы, я буду жахліва па табе сумаваць.

— Я таксама. Белых насовак, здаецца, было больш.

— Не, *праўда* буду. Насамрэч гэта проста *абуральна* і ўвогуле...

— Ну добра, — сказаў малады чалавек і закрыў валізу. Ён зноў закурыў цыгарэту, паглядзеў на ложак і паваліўся на яго. Але як толькі выцягнуўся, радыёпрымач разагрэўся, і ў пакой уварваліся ўрачыстыя гукі велізарнага духавога аркестра — гралі марш Сузы. Яго жонка адвяла за спіну прыгожую руку і выключыла радыё.

— Мусіць перадаваць штосьці яшчэ.

— Ну не ў такую ж *вар'яцкую* рань.

Малады чалавек пусціў пад столь крывавата колца дыму.

— Магла б і не ўставаць.

— Але я *хацела!* — яны разам ужо тры гады, а яна ніяк не навучыцца размаўляць з ім без гэтых перападаў інтанацыі.— Як тут не *ўстаць!*

— Паспрабуй хвалю пяцьсот семдзесят, — сказаў ён. — Мо там што-небудзь ёсць.

Яго жонка зноў уключыла радыё, і яны ўдваіх пачалі чакаць, ён — з закрытымі вачыма. Праз хвіліну зайграў варты даверу джаз.

— У цябе што, і праўда *столькі* часу, каб вось так ляжаць?

— Акурат столькі, каб вось так ляжаць. Яшчэ рана.

Раптам ёй у галаву прыйшла сур'ёзная думка.

— *Спадзяюся,* цябе возьмуць у кавалеры. Кавалеры — гэта так цудоўна! Я проста вар'яцею ад гэтых штуковін, якія ім чапляюць на каўняры! Ну, і ты ж *ездзіш* конна!

— У кавалерыю, — паправіў малады чалавек, не раскрываючы вачэй. — Але гэта наўрад ці. Цяпер усіх у пяхоту бяруць.

— Які *жах,* мілы! Чаму ж ты не патэлефанаваў таму палкоўніку, вось з такой штукай на твары? Палкоўніку. Мы з ім на мінулым тыдні бачыліся ў Філа і Кені. Ён жа з разведкі і ўсё такое. Не, ну сапраўды, ты ж ведаеш французскую, *нямецкую* і ўсё такое. Ён, прынамсі, дапамог бы табе ўладкавацца ў *афіцэры.* Падумай, як цяжка табе будзе служыць шарагоўцам ці як там яго! Ты, шчыра кажучы, нават з людзьмі *размаўляць* не любіш.

— Калі ласка, — сказаў ён, — не трэба пра гэта. Я табе ўжо ўсё растлумачыў. Наконт узвядзення ў афіцэры.

— Я, *прынамсі,* спадзяюся, што цябе адправяць у *Лондан.* Не, ну там жа ёсць хоць нейкія *культурныя* людзі! У цябе ёсць нумар палявой пошты Бабі?

— Так, — схлусіў ён.

У яго жонкі зноў узнікла несумненна сур'ёзная думка.

— Мне б якую ангельскую *тканіну...* Цвід, напрыклад... ды *любую.*

Але раптам яна зноў пазяхнула і сказала тое, чаго не варта было казаць:

— Ты развітаўся з цёткай?

Муж расплюшчыў вочы і рэзка сеў, апусціўшы ногі на падлогу.

— Вірджынія, паслухай... Я ўчора вечарам не паспеў табе сказаць. Хачу, каб ты раз на тыдзень вадзіла яе ў кіно.

— У кіно?

— Гэта не смяротна, — сказаў ён і паўтарыў: — Раз на тыдзень — не смяротна.

— *Вядома ж,* мілы, але...

— Ніякіх «але», — сказаў ён. — Раз на тыдзень — не смяротна.

— Ну *вядома ж,* дурненькі! Я толькі хацела сказаць...

— Шмат ад цябе не патрабуецца. Яна не маладая ўжо, ну і гэтак далей.

— Але, мілы, ёй зноў *пагоршала,* праўда. Яна такая... *кранутая,* нават ужо не *смешна.* Ну і ўвогуле, ты ж цэлымі днямі з ёй дома *не сядзіш.*

— Ты таксама не сядзіш, — сказаў ён. — А яна наогул з пакоя не выходзіць, пакуль я яе куды-небудзь не павяду. — Ён нахіліўся бліжэй да жонкі, так што ледзь не зваліўся з ложка. — Вірджынія, раз на тыдзень — не смяротна. Я не жартую.

— *Вядома ж,* мілы. І праўда, калі ты так *хочаш...*

Малады чалавек раптам устаў.

— Скажы на кухні, што можна падаваць сняданак, — папрасіў ён, накіроўваючыся да дзвярэй.

— Спачатку *пацалуй* мяне, жаўнерык, — адказала жонка.

Ён нахіліўся, пацалаваў яе чароўныя вусны і выйшаў з пакоя. Падняўся на адзін лесвічны пралёт, пакрыты тоўстым кілімам, і павярнуў на пляцоўцы налева. Там пастукаў у другія дзверы — да іх была прышпіленая картка старога нью-ёркскага гатэля «Ўолдарф Асторыя» з надрукаванымі літарамі «Просьба не турбаваць». Наўзбоч была прыпіска выцвілым атрамантам: «Пайшла падпісваццa на Пазыку Свабоды. Хутка буду. Сустрэнь Тома замест мяне — у вестыбюлі ў шэсць. У яго левае плячо вышэйшае за правае і ён курыць цудоўную маленькую люльку. Цалую. Я». Цыдулка была адрасаваная маці маладога чалавека, і ён упершыню прачытаў яе, калі быў маленькім хлапчуком, а потым яшчэ разоў сто. Чытае і цяпер, у сакавіку 1944-га.

— Заходзьце! Заходзьце! — пачуўся дзелавіты голас.

Малады чалавек увайшоў. Ля акна за картачным столікам сядзела вельмі прыгожая дама гадоў пяцідзесяці з гакам у зграбным бэжавым пеньюары і ў вельмі брудных белых кедах.

— Ну, Дзікі Кэмсан, — сказала яна, — навошта ты ўстаў так рана, лайдак ты гэткі?

— Ды сякія-такія справы, — адказаў малады чалавек, з палёгкай усміхаючыся. Ён пацалаваў яе ў шчаку і, паклаўшы адну руку на спінку фатэля, зазірнуў у велізарны альбом, разгорнуты перад жанчынай.

— Як твая калекцыя? — спытаў ён.

— Выдатна. Проста выдатна. Гэты альбом — ты яго і не бачыў яшчэ, бессаромны ты хлопча, — зусім новы. Білі і кухарка будуць аддаваць мне ўсё, што атрымліваюць, дый ты мог бы захаваць для мяне свае.

— Звычайныя амерыканскія гашаныя маркі за два цэнты? Цудоўна прыдумана! — ён агледзеў пакой. — Як радыёпрымач? Працуе?

Прымач быў наладжаны на тую ж хвалю, што і на ніжнім паверсе.

— Выдатна. Зранку я рабіла гімнастыку.

— Слухай, цёця Рэна, я ж прасіў цябе гэтай ідыёцкай гімнастыкі больш не рабіць. Ты ж ёй проста злоўжываеш. Які ў гэтым сэнс?

— А мне падабаецца, — упэўнена адказала цётка і перагарнула старонку альбома. — Мне падабаецца музыка ў эфіры. Усе старыя матывы... Было б несправядліва слухаць музыку і не рабіць практыкаванняў.

— Гэта справядліва. А цяпер выключы яе, калі ласка. Меней сумленнасці, — сказаў пляменнік. Ён крышку пахадзіў па пакоі, а потым цяжка сеў ля падваконня. Паглядзеў на парк, шукаючы сярод дрэваў сцежку, што падвяла б яго да патрэбных словаў пра ад'езд. Ён хацеў, каб яна была адзінай жанчынай у 1944 годзе, якая не сочыць за пясочным гадзіннікам чыйго-небудзь жыцця. Цяпер ён ведаў, што вымушаны паставіць перад ёй свой. Падарунак жанчыне ў запэцканых белых кедах. Жанчыне, якая збірае амерыканскія гашаныя маркі за два цэнты. Жанчыне, якая была сястрой яго маці і пісала ёй цыдулкі на картках старой «Ўолдарф Асторыі». Ці варта ёй гэта ведаць? Ці варта глядзець на дурны бліскучы пясочны гадзіннічак?

— Калі ты вось так морщчыш лоб, то выглядаеш як твая маці. Ага. Зусім як яна. Ты яе ўвогуле памятаеш, Рычард?

— Памятаю, — ён на момант задумаўся. — Яна ніколі не хадзіла. Яна заўжды бегала, а потым у якім пакоі раптам спынялася. Яшчэ яна заўжды насвіствала скрозь зубы, калі зашморгвала ў маім пакоі фіранкі. Амаль заўсёды адзін матыў. Я ўвесь час памятаў яго, пакуль быў дзіцем, але пасталеў і забыў. Потым у каледжы ў мяне быў сусед з Мэмфіса, аднойчы ён заводзіў старыя кружэлкі — штосьці з Бэсі Сміт, штосьці з Ці Гардэн, і там была адна песня, яна мяне проста агаломшыла... мелодыя, якую скрозь зубы насвіствала маці, так! Яна называлася «Не магу быць добрай у нядзелю, калі тыдзень я гарэжу спрэс». Але адзін хлопец, яго звалі Алтрыеві, наступіў у канцы семестра на кружэлку, і больш я яе ніколі не чуў. — Ён памаўчаў. — Вось і ўсё, што я памятаю, дурасць нейкая.

— Памятаеш, як яна выглядала?

— Не.

— Яна была што трэба! — цётка падперла падбароддзе худой зграбнай рукой.— Твой бацька не мог уседзець на месцы, калі маці выходзіла з пакоя. Ківаў як дурань, калі да яго звярталіся, а сам не адводзіў вачэй ад дзвярэй, з якіх яна выйшла. Ён быў дзіўны і нейкі грубы чалавек. Нічым не цікавіўся, толькі зараблял грошы і глядзеў на тваю маці. Ну і катаў яе на той жудаснай яхце, што тады набыў. Ён надзяваў такую забаўную ангельскую матроскую шапачку. Гаварыў, дасталася ад бацькі. Твая маці заўжды яе хавала, калі яны збіраліся катацца.

— І гэта адзінае, што тады знайшлі, так? — спытаў малады чалавек. — Гэтую шапачку?

Але цётчын позірк ужо ўпаў на старонку альбома.

— О, якая прыгажосць! — сказала яна, падносячы адну марку да святла. — У яго такі мужны, валявы твар з перабітым носам. Гэта Вашынгтон.

Малады чалавек устаў.

— Вірджынія сказала на кухні, каб падавалі сняданак. Мне ўжо лепш ісці, — сказаў ён, але не выйшаў, а наблізіўся да картачнага століка і сеў. — Цёця Рэна, паслухай мяне хвілінку.

Яна падняла на яго разумны твар.

— Цёця... м-м-м... разумееш, пачалася вайна... М-м-м... Ну, ты ж бачыла ў кіначасопісах, так? Ну, чула па радыё і ўсё такое, праўда?

— Безумоўна! — фыркнула яна.

— Ну вось, я з'язджаю. Павінен. Еду сёння раніцай.

— Я ведала, што ты павінен, — сказала яна без панікі, без сентыментальнага плачу па «апошнім». Цудоўная жанчына, падумаў ён. Самая нармальная ў свеце.

Малады чалавек устаў, пакідаючы ёй свой пясочны гадзіннік без непатрэбнай далікатнасці — толькі так і правільна.

— Вірджынія будзе часта да цябе зазіраць, мілая, — сказаў ён. — І вадзіць у кіно. На наступным тыдні ў «Сатан» будзе стары фільм Філдса. Ты ж яго любіш.

Цётка таксама ўстала, але хуценька праслізнула міма яго.

— У мяне для цябе рэкамендацыйны ліст, — абвясціла яна. — Да майго прыяцеля.

Яна падышла да пісьмовага стала, не вагаючыся высунула левую верхнюю шуфляду і дастала белы канверт. Потым вярнулася да століка, дзе ляжаў альбом з маркамі, мімаходзь сунуўшы канверт пляменніку.

— Ён не запячатаны, — сказала яна. — Прачытай, калі хочаш.

Малады чалавек паглядзеў на канверт. Валявым цётчыным почыркам ён быў падпісаны нейкаму лейтэнанту Томасу Э. Кліву-малодшаму.

— Цудоўны малады чалавек, — сказала яна. — Служыць у шэсцьдзясят дзявятай. Ён прыглядзіць за табой, я нават не хвалююся, — і дадала выразна: — Я ўжо два гады таму ведала, што гэта здарыцца, і адразу падумала пра Томі. Ён будзе да цябе спагадлівы,— яна зноў павярнулася, цяпер хутчэй няўважліва, і ўжо марудней вярнулася да стала. Зноў высунула шуфляду і дастала вялікі фотаздымак у рамцы, на ім — хлопец у форме малодшага лейтэнанта ўзору 1917 года з высокім каўняром.

Хістаючыся, яна падышла да пляменніка і падала яму фатаграфію.

— Вось яго здымак, — сказала яна. — Здымак Тома Кліва.

— Трэба ісці, цёця, — сказаў малады чалавек. — Да пабачэння. Усё патрэбнае ў цябе будзе. Усё, праўда. Я табе напішу.

— Да пабачэння, мой мілы, мілы хлопча, — сказала цётка і пацалавала яго. — Абавязкова знайдзі Тома Кліва. Ён за табой прыглядзіць, пакуль ты ўладкуешся і ўсё такое.

— Так, так. Да пабачэння.

— Да пабачэння, мілы хлопча, — безуважна паўтарыла яна.

— Да пабачэння.

Ён выйшаў з пакоя і на лесвіцы ледзь не спатыкнуўся. На ніжняй пляцоўцы выцягнуў канверт і парваў напалам, яшчэ напалам і яшчэ напалам. Не ведаючы, што рабіць з абрыўкамі, засунуў іх у кішэню штаноў.

— Мілы, усё ўжо *астыла.* Ячня і ўвогуле...

— Ты можаш вадзіць яе раз на тыдзень у кіно, — сказаў ён. — Раз на тыдзень — не смяротна.

— Я ж не *супраць...* Хіба я штосьці гавару?

— Не.

Ён увайшоў у сталовы пакой.

1944

Пераклаў з ангельскай
Аляксей Арцёмаў

АПАВЯДАННЕ

DER ARME DOLMETSCHER[1]

Курт ВОНЭГУТ
(1922–2007)

Аднойчы ў 1944 годзе, калі я знаходзіўся на самай лініі фронту, пад пякельны грукат гарматаў мне паведамілі, што я прызначаны перакладчыкам (ці, калі вам так больш падабаецца, Dolmetscher'ам) для цэлага батальёна, пасля чаго мяне адразу засялілі ў дом бельгійскага бургамістра — туды не дацягваліся залпы артылерыі з лініі Зігфрыда.

Да гэтага мне ніколі не прыходзіла ў галаву, што я магу быць перакладчыкам. Але я быў прызначаны на гэтую пасаду акурат тады, калі чакаў пераезду з Францыі ў самае пекла фронту. Калі я быў студэнтам, мой сусед па пакоі ўвесь час паўтараў першае чатырохрадкоўе «Ларэляй» Генрыха Гайнэ, і так атрымалася, што я іх запомніў і меў дурасць паўтарыць яго на недазвольна блізкай адлегласці ад нашага батальённага кіраўніцтва. Палкоўнік (былы гатэльны дэтэктыў з Мобіла) спытаў свайго старшага памочніка (былы гандляр тканінамі з Ноксвіля), на якой мове гэты верш. Памочнік дачакаўся, пакуль я дамармычу «Der Gipfel des Berges foo-unk-kelt im Abendsonnenschein», і вынес прысуд:

— Здаецца, гэта нямецкая, палкоўнік.

Калі перакласці тое, што я ведаў па-нямецку, атрымаецца прыблізна так: «Не ведаю, што здарылася са мной, чаму мне так сумна. Я не магу забыць старую легенду. Халодна, робіцца цёмна, і павольна цячэ Рэйн. Горны пік ззяе, калі знікае сонца».

Палкоўнік адчуваў, што ў яго абавязкі ўваходзіць прымаць хуткія разумныя рашэнні. За вайну палкоўнік прыняў цэлы шэраг геніяльных рашэнняў, але тут, здаецца, пераўзышоў самога сябе. Прынамсі, я так лічу.

— Калі гэта нямецкая мова, што ён робіць тут? — захацеў даведацца палкоўнік. Праз дзве гадзіны наш ваенны клерк загадаў мне кінуць працаваць, бо я цяпер — батальённы перакладчык.

Неўзабаве прыйшоў загад пра перамяшчэнне. Кіраўніцтву было не да маіх заяваў пра ўласную некампетэнтнасць.

— Ты размаўляеш па-нямецку на дастатковым для нас узроўні. Мы з фрыцамі доўгіх размоваў весці не будзем, — сказаў мне старшы памочнік. — А гэта будзе твой слоўнік, — сказаў ён і паказаў на вінтоўку.

Памочнік, асноўнай крыніцай пазнання жыцця для якога быў наш палкоўнік, верыў, што амерыканская армія толькі што перамагла бельгійцаў, і цяпер я павінен пасяліцца ў бургамістра, каб мы былі ўпэўненыя, што ён не які-небудзь шпіён.

— І ўвогуле, — падвёў вынікі памочнік, — ніхто з нас, апроч цябе, па-іхнаму не шпрэхае.

У грузавіку, які вёз мяне да бургамістра, я пазнаёміўся з трыма змрочнымі пенсільванцамі — нашчадкамі нямецкіх эмігрантаў, — якія добраахвотна пайшлі ў перакладчыкі прыкладна месяц таму. Калі яны ўрэшце зразумелі, што я ім, мякка кажучы, не канкурэнт і што спадзяюся быць выгнаным з перакладчыцкай пасады цягам дваццаці чатырох гадзін, яны прасякнуліся сімпатыяй і нават паведамілі, што цяпер я называюся Dolmetscher. Яны нават пераклалі мне «Ларэляй». Цяпер у маім слоўнікавым запасе было каля сарака словаў (што пахвальна для двухгадовага дзіцяці), але ніводная іх камбінацыя не магла б забяспечыць мне нават шклянку вады.

З кожным паваротам грузавіка я задаваў новае пытанне.

— Як па-нямецку «войска»? Як мне спытаць «Дзе ванная?». Як будзе «мне дрэнна»… «добра»… «талерка»... «брат»… «чаравік»?..

Мае флегматычныя інструктары стаміліся, і адзін даў мне кніжачку, кшталту «Нямецкая мова для тых, хто ў акопах».

— Там у пачатку не хапае старонак, — сказаў мне на развітанне адзін з маіх «настаўнікаў» (я якраз злез з грузавіка ля цаглянага дома бургамістра). — Мы з іх самакруткі рабілі.

Раніца толькі пачыналася, калі я пагрукаў у дзверы бургамістра. Я адчуваў сябе акторам другога плана, які чакае выхаду на сцэну, у пустой галаве круцілася адна-адзіная фраза. Дзверы адчыніліся.

— Dolmetscher, — сказаў я.

Дзверы адчыніў сам бургамістр, высокі стары спадар у начнушцы, які адвёў мяне ў мой пакой на другім паверсе. Ён даволі гасцінна жэстыкуляваў і нешта казаў, так што час ад часу гаварыць «danke schön» падалося мне цалкам адэкватным. Я вырашыў забіць нашую размову загатоўкай: «Ich weiss nicht, was soll es bedeuten, dass ich so traurig bin» [2]. Ён бы пайшоў спаць, зразумеўшы, што яму трапіўся дасведчаны і поўны сусветнага смутку перакладчык. Як высветлілася, гэта было неабавязкова: ён сам хутка сыйшоў, каб я мог сабрацца з думкамі.

Галоўным маім скарбам у той момант была кніжачка. Я вывучаў кожную каштоўную старонку і дзівіўся, як проста ангельскія словы перакладаюцца на нямецкую. Усё, што ад мяне патрабавалася, — гэта знайсці ў левым слупку патрэбную ангельскую фразу, а пасля прачытаць бэссэнсоўны набор сімвалаў у правым. Напрыклад, «Колькі ў вас гранатамётаў?» гучала як «Віі філ грэнада ўэафэа хабэн зіі?» Выкшталцоная нямецкая мова ў фразе «Дзе вашыя танкавыя калоны?» гучала не складаней чым «Во зінт эрн панзэр шпіцэн?». Я шаптаў фразы: «Дзе вашыя гаўбіцы?», «Колькі ў вас кулямётаў?», «Здавайцеся!», «Не страляць!», «Дзе вы схавалі свой матацыкл?», «Рукі ўверх!», «З якой вы дывізіі?».

Кніжачка скончылася нечакана, а мой стан перайшоў з маніякальнага ў дэпрэсіўны. Пенсільванцы скурылі ўсю «ветлівасць», якая была ў першай палове кніжачкі, пакінуўшы мне з той ветлівасці толькі «асабліваці рукапашнага бою».

Пакуль я ляжаў без сну, у маёй галаве разыгралася драма, у якой я мог бы паўдзельнічаць.

ПЕРАКЛАДЧЫК *(дачцэ бургамістра):* Не ведаю, што здарылася са мной, чаму мне так сумна *(абдымае яе).*

ДАЧКА БУРГАМІСТРА *(сарамліва):* Халодна, робіцца цёмна, і павольна цячэ Рэйн.

Перакладчык бярэ яе на рукі і нясе ў свой пакой.

ПЕРАКЛАДЧЫК *(пяшчотна):* Здавайся!

БУРГАМІСТР *(забягае з пісталетам):* Ах! Рукі ўверх!

ПЕРАКЛАДЧЫК І ДАЧКА БУРГАМІСТРА: Не страляйце!

З кішэні бургамістра выпадае карта з дыспазіцыяй Першай амерыканскай арміі.

ПЕРАКЛАДЧЫК *(убок, па-ангельску):* Навошта гэтаму прасаюзніцкаму бургамістру карта з дыспазіцыяй Першай амерыканскай арміі? І чаму я павінен перакладаць з нямецкай, калі ён бельгіец? *(выцягвае з-пад падушкі пісталет 45-га калібру і настаўляе на бургамістра).*

БУРГАМІСТР і ДАЧКА БУРГАМІСТРА: Не страляйце! *(бургамістр кідае пісталет, нервова ўсміхаецца).*

ПЕРАКЛАДЧЫК: З якой вы дывізіі? *(бургамістр маўчыць, да яго падыходзіць дачка, ціха плачучы. Перакладчык не пускае яе).* Дзе вы схавалі свой матацыкл? Дзе вашыя гаўбіцы? Дзе вашыя танкавыя калоны? Колькі ў вас гранатамётаў?

БУРГАМІСТР *(разумеючы сваё становішча):* Я… Я здаюся?

ДАЧКА БУРГАМІСТРА: Мне так сумна.

Уваходзіць варта з трох пенсільванцаў, якія праходзілі ля дома і пачулі, як бургамістр і дачка бургамістра прызнаюцца ў тым, што яны фашысцкія агенты-парашутысты.

Ёган Крыстаф Фрыдрых фон Шылер — і той не прыдумаў бы лепей, калі б мусіў карыстацца толькі словамі, якія былі ў мяне. У астатнім я не меў ніякіх шанцаў. Да таго ж, не самая прыемная штука быць перакладчыкам у снежні і нават не ведаць, як сказаць «Вясёлых Калядаў».

Я прыбраў ложак і вылез праз акно на двор.

Варта адправіла мяне ў штаб, дзе я сустрэў большую частку нашых афіцэраў. Некаторыя схіліліся над картамі, некаторыя чысцілі зброю. Атмасфера была досыць святочная. Памочнік нашага палкоўніка гуляўся з 18-дзюймавым нажом і спяваў «Are You from Dixie?»

— Халера! — закрычаў ён, убачыўшы мяне. — Гэта ж наш Шпрэхен-зі-дойч! Ну, раскажвай, як там табе ў варожым доме!

— Нічога добрага, — сказаў я. — Яны размаўляюць на ніжненямецкай, а я — на верхненямецкай.

Гэта вельмі ўразіла памочніка.

— Ты занадта адукаваны для іх, так?

Ён прабегся пальцамі па лязе свайго страшэннага нажа.

— Думаю, хутка возьмем таго, хто можа размаўляць на любой нямецкай. — І дадаў: — Мы капітулявалі.

— Мы ім яшчэ пакажам, як зрабілі ў Тэнэсі, — сказаў палкоўнік, які на радзіме, у прыватнасці ў Тэнэсі, заўжды перамагаў на вучэннях. — Ты заставайся тут, хлопча. Тваю нам спатрэбіцца перакладчык.

Праз дваццаць хвілін мне зноў давялося ператварыцца ў перакладчыка. Чатыры нямецкія танкі пад'ехалі да нашага штаба, і два тузіны немцаў з кулямётамі сагналі нас у кучу.

— А ну давай, скажы ім пару ласкавых, — звярнуўся да мяне палкоўнік, дзёрзкі да апошняга.

Я хуценька прабегся па сваёй кніжачцы, пакуль не знайшоў фразу, якая найлепш адлюстроўвала нашыя пачуцці:

— Не страляйце!

Нямецкі афіцэр падышоў да нас, каб паглядзець, каго злавіў. У яго руцэ была кніжачка, трохі меншая за маю. Ён спытаў:

— Дзе вашыя гаўбіцы?



[1] Der Arme Dolmetscher — бядак-перакладчык (ням.).
[2] Першыя два радкі з «Ларэляй» Г. Гайнэ: «Не ведаю, што здарылася са мной, чаму мне так сумна...».

Пераклаў з ангельскай
Юрась Ускоў.

ПУБЛІКАЦЫІ

ЗАПАВЕТЫ ЯКУБА КОЛАСА

ПАСЛЯЮБІЛЕЙНЫЯ РАЗВАГІ

Вера МІЦКЕВІЧ

Мінулы год, багаты на літаратурныя юбілеі Янкі Купалы, Максіма Танка, Якуба Коласа, парадаваў шматлікімі публікацыямі, даследваннямі. Асобныя нумары рэспубліканскіх літаратурных часопісаў былі прысвечаны народным паэтам. На пачатку студзеня выйшаў з друку апошні 20-ы том Збору твораў Якуба Коласа...

«Verba volant, scripta manent» — «Словы адлятаюць, запісанае застаецца», — казалі старажытныя рымляне. Так, напісана шмат, але некаторыя моманты ў публікацыях выклікаюць здзіўленне, недаўменне ці нават абурэнне.

Першае, што мяне ўразіла, — гэта досыць свавольнае абыходжанне з выключным па сваім змесце і магутнасці гучання публіцыстычным творам Я. Коласа «Мой запавет». У газеце «Народная Воля» ад 21.08.2012 г. у рубрыцы «Асобы» змешчаны матэрыял Георгія Чыгіра «Я прыйшоў дзеля Вас...» — грунтоўнае і цікавае інтэрв'ю, якое заканчваецца ўзятым у двукоссе тэкстам «Майго запавету». Праўда, уласна ад запавету там мала што засталося: назва і дата напісання адсутнічаюць, а па самім тэксце я налічыла каля 20 памылак... Вось такая «лыжка дзёгцю» на пасашок. Арыгінал твора знаходзіцца ў фондах музея песняра, была магчымасць удакладніць па першакрыніцы. Упершыню «Мой запавет» Я. Коласа быў надрукаваны ў газеце «Рэспубліка» ад 31.10.1992 г. на першай старонцы ў факсімільным варыянце. Можна было звярнуцца і да гэтай публікацыі...

Але ж сапраўдная кульмінацыя непавагі да выдатнага твора чакала мяне, як і ўсіх прысутных, на заключным юбілейным мерапрыемстве ў Белдзяржфілармоніі 15 снежня 2012 года, дзе ўжо са сцэны ўрачыста гучаў «Мой запавет» з такім жа мноствам памылак!

Сорамна, спадарства! На вялікі жаль, не абышлося без памылак, праўда, у значна меншай колькасці, і ў 16-ым томе апошняга Збору твораў Я. Коласа, куды быў уключаны «Мой запавет» упершыню. Гэтыя памылкі, як і іншыя, знойдзеныя ў 1-19-ым тамах, былі выпраўлены ў раздзеле «Заўважаныя памылкі і недакладнасці» ў апошнім 20-ым томе.

Што датычыць Збору твораў у 20-ці тамах — гэта прадмет асобнага даследвання. Была зроблена велізарная праца па ўкладанні, стварэнні навуковага каментара, якая вялася на працягу многіх гадоў цэлым калектывам тэксталагаў, музейшчыкаў, архівістаў, выдаўцоў, сябраў Рэдакцыйнай рады. Былі розныя думкі, спрэчныя пазіцыі, не заўсёды ўдавалася даследаваць тую ці іншую сітуацыю, ды і калектыў тэкстолагаў мяняўся. І, безумоўна, памылкі будуць яшчэ знаходзіцца і ўдакладняцца. Для прыкладу: так і не была выпраўлена памылка тлумачэння значэння слова «ворчык» у кантэксце паэмы Я. Коласа «Новая зямля»: «Прывёў ён дзядзьку ў карыдорчык // (Абодвух іх трымае ворчык)». У 8-ым томе Збору (падрыхтавала тэксты і каментары 8-га тома Э.А.Золава) у каментарыі пададзена: «ворчык — прыстасаванне для прыпрэжкі каня ў дапамогу каранніку; барак; тут: у пераносным значэнні», у папярэдніх двух Зборах твораў — «пастронак». У кантэксце «Новай зямлі» слова «ворчык» — невялікі мяшок, торба, ад польскага worek — woreczek — мяшочак, сумка з тканіны. Сэнс тут адзіны: дзядзька Антось едзе на цягніку ў Вільню «зайцам», у «торбе з кутасамі» трымае «хабар», каб аддзячыць кандуктару, і кандуктар цудоўна пра гэта ведае. Так занатавана — звяртаю ўвагу — у прыжыццёвым! Зборы твораў класіка ў 7-тамах (т. 4, с. 496), калі сам народны паэт праглядаў паэму, рабіў заўвагі па тэкстах. Пацвярджэнне знаходзім у «Матэрыялах для слоўніка мінска-маладзечанскіх гаворак» пад рэдакцыяй М.Жыдовіч (Мінск, выд-ва БДУ, 1974, с. 35): ворак — мяшок.

Далей — публікацыя ў газеце «Комсомольская правда» ад 29 лістапада–5 снежня 2012 г. Надзеі Белахвосцік з доўгай назвай «Якуб Колас неохотно платил партийные взносы, но помогал деньгами Анне Ахматовой», дзе ёсць, на першы погляд, дробныя, але нядбайныя памылкі. У пераліку псеўданімаў Я. Коласа: КуКодесник — памылка друку, трэба — Кудесник; псеўданімы Марцін, Марцін з-за рэчкі — Я. Коласу не належаць. Цытата з тэксту: «...огромное впечатление произвело стихотворение народовольца Якубовича-Мельшина «Колос». У сапраўднасці размова ідзе пра пераклад Пятром Якубовічам-Мельшыным на расійскую мову з польскай верша «Батрак» польскай паэтэсы Марыі Канапніцкай, які ў арыгінале называецца «Wolny najmita» (гл. часопіс «Полымя», 1994, № 7, с. 245). Нарэшце, у апошнім сюжэце вядзецца размова пра ўжо шырокавядомы ліст Я. Коласа аб стане беларускай мовы, які ён прынёсіў у ЦК КПБ у апошні дзень свайго жыцця. І зусім не «сложно сказать, когда оно было написано» — 25.05.1956 г., калі пазнаёміцца з дакументамі і матэрыяламі ў кнізе «Купала і Колас, вы нас гадавалі» (кніга другая, частка другая, укладальнікі В. Селяменеў, В. Скалабан, Мінск, 2012, с.194–201).

Летась пабачыла свет кніга слонімскага краязнаўцы, пісьменніка Сяргея Чыгрына «Па слядах Купалы і Коласа» (Мінск, Кнігазбор, 2012), якую складаюць


2 IV 1946 г.

Мой Запавет.

Я — рыба, выкінутая на пясок. Калі-б хто захацеў, каб рыбу ~~...~~ пакінуць жывою, то ён-ці той — Дагадаецца-б зараз — то кінуць у вядро з чыстаю, халоднаю вадою. Ату рыбу. Такіх добрых душ няма. А я і не крыўдуюся: я — часовы вандроўнік, чые гадзіны адлічаны, я — той, каму пара сказаць: я — ваш нядоўгі госць!.. Надыходзіць вясна. Жыццё абуджаецца з новаю сілаю, а я так моцна звязаны з жыццём, што мне не хочацца пакідаць вас, мае сябры, мае лясы, мае лугі, мае рэчкі, мае крыніцы і чорнагаловыя баравікі!

Я прышоў у жыццё не для сябе самога — я прышоў дзеля

літаратурна-краязнаўчыя артыкулы і вершы. Вельмі добра, што пад адну вокладку сабраны напісаныя ў розныя гады цікавыя артыкулы. Узбагачаюць кнігу раздзелы пра Уладзіслава Чаржынскага і Аляксандра Вазнясенскага. У раздзеле «Незабыўны Алег Лойка і яго згадкі пра песняроў» чытаю: «Алег Антонавіч пра Купалу і Коласа мог распавядаць гадзінамі [...] Жонка Якуба Коласа — Марыя Дзмітрыеўна — была даволі багатай жанчынай, ідэальнай, інтэлігентнай мяшчанкай, вельмі выхаванай, хатняй, аддана мужу». Ствараецца такое ўражанне, што Канстанцін Міхайлавіч толькі таму і ажаніўся з Марыяй Каменскай, што яна была багатай. І як жа гэта «багатая мяшчанка» пайшла замуж за простага настаўніка, сялянскага сына, які толькі год як выйшаў з турмы? Для параўнання прывяду іншыя цытаты. З перапіскі родных братоў Марыі Дзмітрыеўны Івана і Міхаіла Каменскіх, Іван піша брату ў 1911–1912 гадах: «К празднику [Вялікдня. — В.М.] купил Маруси шляпу за 8 р. и дал ей 10 р. на шитьё жакета...»

Вельмі хацелася б, каб такія неабходныя кожнаму творцу рысы, як этычнасць, дакладнасць, вывeранасць фактаў, адказнасць за пададзеныя звесткі ў друку заставаліся галоўнымі ў іх дзейнасці

(прыватны архіў). З кнігі Данілы Міцкевіча «Любіць і помніць» пра побыт сям'і на Куршчыне ў 1917-1920-х гадах: «Памятаю, як зусім знясіленая хваробай і голадам мама апусцілася на падлогу школьную дошку, паклала на яе мяне і майго меншага брата Юрку і сама, знямоганая, легла з намі. Прыйшоў бацька, пабачыў нас у такім стане і заплакаў. Кінуўся ратаваць...». Такое было багацце! Так, Марыя Дзмітрыеўна была багатай — сваёю душою, светапоглядам, чуллівым сэрцам, светлымі думкамі. Дарэчы, пры жыцці сам Алег Антонавіч не падаваў гэтыя эпізоды ў друку. Тое ж датычыць яго выказванняў у кнізе С. Чыгрына «Па слядах Купалы і Коласа» пра пляменніцу Янкі Купалы Ядвігу Юліянаўну Раманоўскую. Куды цікавейшай і патрэбнай мне падаецца пошукавая праца па лініі прататыпа коласаўскай Ядвісі: знайсці яе сляды ў Польшчы, нашчадкаў, удакладніць біяграфічныя звесткі. Вядома, што Ядвіга Ігнатаўна Баранцэвіч жыла ў Слоніме, пасля пераехала ў Польшчу. У запісках Данілы Міцкевіча пазначана, што яе прозвішча па мужу — Бушынская...

У «Летапісе жыцця і творчасці Якуба Коласа», складзеным Міхасём Мушынскім (апошняе выданне 2012 года, больш чым 1120 старонак), Я. Колас «аднойчы застаўся на тыдні два» на Валожыншчыне. Адзін-два дні — яшчэ можна дапусціць, а не паўмесяца. Але далей сюжэт становіцца падобным на фантастыку: Я. Коласа ў вёсцы Палачанка наведвае і жыве побач у палатцы, вядзе з песняром размовы...Уладзімір Дубоўка. Дубоўка, які па апошнім прыгаворы быў рэабілітаваны позняй восенню 1957 года і ўпершыню за 26 гадоў прыехаў з высылкі ў Беларусь у снежні 1957-га! Дзе быў Я. Колас у той час — тлумачыць не трэба: на Вайсковых могілках. Дакументальна вядома іншае. У 1955 годзе Я. Колас вёў з У. Дубоўкам перапіску, пісаў у Пракуратуру СССР, каб хутчэй вызваліць з няволі таленавітага пісьменніка. На вялікі жаль, сустрэцца ім ужо не давялося...

«Дзе густа, а дзе пуста»... Такое ўражанне склалася ад знаёмства з кнігай «Гісторыя Пінска. Ад старажытнасці да сучаснасці» (Мінск, Вышэйшая школа, 2012), падрыхтаванай аўтарскім калектывам. Безумоўна, гэта вельмі патрэбнае выданне, у якім, як пазначана ў анатацыі, «упершыню на вялізным дакументальным матэрыяле са шматлікіх айчынных і замежных архіваў даследуецца гістарычнае аблічча горада Пінска ад старажытнага часу да сучаснасці». Зацікавіла інфармацыя пра гісторыю Палескіх чыгунак, пра грамадскае жыццё горада, перыядычныя выданні, пра перыяд Першай сусветнай вайны. Там жа жыў Я. Колас у 1912–1915 гадах, у Пінску працаваў настаўнікам, развіваўся як творца, стварыў сям'ю, прызываўся ў войска, сыходзіў з сям'ёю ў бежанства. Лагічна было б убачыць падраздзел, прысвечаны песняру, у 4-м раздзеле кнігі «Пінск у складзе Расійскай імперыі». Тым болей, што ў кнізе ёсць падраздзелы 5.5 («Палескія дні Аляксандра Блока») і 6.4 («С. Булак-Балаховіч у Пінску»). І якое ж чакала мяне здзіўленне, калі на 70 старонках 4-га раздзела адшукаўся ўсяго адзін абзац: «Свае замалёўкі аб жыцці простых пінчукоў пакінуў Якуб Колас, які ў 1912 г. жыў у Пінску і выкладаў у прыходскім вучылішчы». І далей прыведзены ўрывак з трылогіі «На ростанях» пра палешукоў. Вывады напрошваюцца самі сабой...

На двары — XXI стагоддзе, новае тысячагоддзе, свет валодае навейшымі інфармацыйнымі тэхналогіямі і магчымасцямі. Знаходзяць, ствараюць, апрацоўваюць гэтую інфармацыю далёка не механічныя робаты, а прафесійныя журналісты, навукоўцы, пісьменнікі, гісторыкі. І вельмі хацелася б, каб такія неабходныя кожнаму творцу рысы, як этычнасць, дакладнасць, вывeранасць фактаў, адказнасць за пададзеныя звесткі ў друку заставаліся галоўнымі ў іх дзейнасці. У большасці сваёй сучасны чытач — абывацель, які верыць таму, што і як напісана, і не ўнікае ў дэталі і сэнс. Матэрыялы ж, пададзеныя на высокім прафесійным узроўні, даюць магчымасць чытачу граматна арыентавацца ў велізарнай сучаснай інфармацыйнай плыні.

▸ ДРУК

«НЕ ЗРОКАМ, А СЭРЦАМ…»

ЛеГАЛ

Аналізуеш літаратурныя разборкі на сайтах і каментары ў сацыяльных сетках і думаеш: кранты беларускаму пісьменству, а ты яшчэ спрабуеш выстройваць нейкія пражэкты… Ніхто даўно нічога вартага не піша на гэтай сялянскай і літаратурна недаспелай мове, на якую ўжо і ў аграгарадках моршчацца… Словам, ні твораў, ні чытачоў.

Нацыянальны ступар. Але, адсопшыся, чытаеш на тых жа сайтах і ў друкаванай перыёдыцы рэцэнзіі на новыя кнігі нашых пісьменнікаў — і наноў шызееш, бо, аказваецца, што мы на новым вітку творчага ўздыму і нарэшце дараслі да еўрапейскіх мастацкіх каштоўнасцяў! І ў Тані — талент, і ў Мані — дар, і Валодзя — геній, і Альгерд — прарок…

Адкуль раптам такі кантраст?! Я вам скажу: ён з аднаго месца — з-пад пыльнай клавіятуры. Менавіта там ашываецца заразны вірус, які з цягам часу дарэшты забівае творчую патэнцыю літаратараў. За кампутарам (ці наўтбукам) чалавек ужо цалкам не аддае сябе мастацкаму тварэнню (суперажыванню пражытага — цяжкай і нярэдка пакутнай душэўнай і духоўнай працы), а ўскладвае надзеі на дапамогу штучнага электроннага інтэлекту (і гэта робіцца ўжо на падсвядомым узроўні і часам нават незалежна ад нашых намаганняў)…

На гэтым фронце ўсё трошкі іншае — і пісьменнік, і тэкст, і чытач. Усе яны эвалюцыянавалі ў бок сучасных нанатэхналогій, пакінуўшы не паспяваючую следам за імі прыроду сутнаснага зямнога чалавека (яго тонкія пачуцці, перажыванні, боль і слёзы, што робіцца ўсё больш і часцей абыякавымі, незразумелымі і непрымальнымі — проста лішнімі — для машыннага мыслення). Пара б ужо літаратарам, літаратуразнаўцам і крытыкам сабрацца за круглым сталом ды сур'ёзна і грунтоўна, а не похапкам і ў раздрай, абмеркаваць гэтую праблему — развіццё сучаснай беларускай нацыянальнай літаратуры. А самае істотнае з таго апублікаваць у літаратурнай перыёдыцы для шырокага кола чытачоў і падвядзення нейкай, няхай і няпэўнай і часовай, рысы…

Гэта вось такая набалелая запеўка для чарговага агляду «Дзеяслова», у якім, дарэчы, ёсць што пачытаць і адзначыць.

Любоў, спагада, развага, споведзь і спадзяванне ў лепшых радках вершаў вядомага паэта **Васіля Зуёнка.** Даніна душы ўсяму паміраючаму і смяротнаму… Васіль Васільевіч, як сёння модна казаць, не такі раскручаны (ды проста ніколькі не раскручаны), як, скажам, яго калегі па пакаленню Барадулін, Бураўкін ці Гілевіч, аднак вядомы выбітнымі сваімі творамі, пачынаючы ад помнага многімі: *«Ніхто не пачуў: яблык упаў дасвеццем — ля Халопеніч, на Беларусі. Ніхто не пачуў — ні людзі, ні травы, ні вецер… Ніхто, а свет зямны здрыгануўся…».* Новыя вершы паэта, як лірычнае (а значыць, шчырае) апраўданне пражытага — не перад людзьмі, умоўнымі чытачамі, а перад той таямнічай апошняй іпастассю, што ёсць тут над усім сутнасным…

Гары, згарай, мая душа.
А можа, покуль змрок агорне, —
Няхай не з зорнага каўша
Святло пальецца — хай спярша
Камусьці ў беспрасветнай зборні
На кропельку — а стане зорней…



Працягнута друкаванне рамана «Грэх» **Алеся Усені.** Можна было б, у пэўным сэнсе, лічыць першую палову рамана пашыранымі літаратурнымі ілюстрацыямі да яго глыбокай гістарычнай архіўнай канвы, калі б не ідэйная лінія, якая, па аўтарскай прадмове бачна, нейкім чынам звязвае тую эпоху (напоўненую цяжкай і няроўнай па сіле барацьбой іудзеяў з Рымскай імперыяй за суверэннасць Ізраіля, якая, на жаль, абярнулася поўнай паразай яўрэяў і адцягнула іх чаканую мэту дзяржаўнасці ажно да 1948 года) з сучаснымі рэаліямі жыцця ўжо ў другой кніжцы рамана… Вельмі просты і празрысты стыль пісьма дае нечаканы эфект — ён хвалюе непрадбачанымі падзеямі і ўчынкамі герояў і зацягвае ў хранікальна-таямнічы інтрыгуючы сюжэтны калейдаскоп аўтарскага стрыманага расповеду…

Рэдкая публікацыя вершаў вядомага паэта **Алега Мінкіна,** які жыве ў Вільні, зарабляючы гастарбайтарствам на будоўлях Масквы, вылучаецца адметным лірызмам, душэўнай танальнасцю і ўнутранай мелодыкай. І хоць цяперашнія яго вершы «грашаць» палітычнай і сацыяльнай публіцыстычнасцю, але, як заўжды, іх празаічны змест укладзены ў шыкоўна-каларытную нацыянальную абгортку… Вобраз сучаснага беларуса Кукабакі прыцягнуты да хаямаўскага хмельна-лірычнага ўвасаблення… Такім чынам, можна лічыць, што па часе адбыўся пераход паэта ад стварэння самотна-замілаваных, пэўным чынам, настальгічных вобразаў беларускай нацыянальнай гісторыі да вобразаў сучасных, поўных скептыцызму, іроніі і паблажліва-крытычнай прыземленасці… Вось узор сінтэзу класічнага (кніжнага) з некласічным (грамадзянска-патрыятычным) лірычным вобразам сучаснага А. Мінкіна ў вершы «Васілёк»:

Стракочуць зычна конікі ля ганку
«Салёна прыгажосці», дзе ад ранку
Дзяўчына з вёскі беларускай Петракі
Наколкі робіць і праколвае пупкі.
А недзе там лагодны ветрык вее,
Сінее васілёк і жыта палавее…
І ў забіўцы выколвае рука
Замест пачвары кветку васілька.

Прадоўжана публікацыя апавяданняў **Віктара Казько,** напісаных у эксперыментальным жанры, блізкім па стылі да антыўтопіі. Шматмерныя і неадназначныя вобразы Моці, утрыраваныя і гіпербалізаваныя, пераасэнсоўваюцца і дадумваюцца чытачом па ходу чытання, пісьменнік толькі робіць пэўныя намёкі, падказвае арыенціры, накіроўваючы ў правільны бок, каб неўпрыкмет вывесці на правільны шлях — у нашу сучасную па-свойму шчаслівую электаральную Беларусь… Складнікі расповеду — іронія ды гумар — тут сябе апраўдваюць.

Васіль Макарэвіч вядомы як адмысловы майстар вершаскладання (асабліва вызначыўся ў паэмах) — адбойная рытміка, віртуозная рыфмоўка (напорысты публіцыстычны стыль паводле Маякоўскага). Яго творы вартыя прачытання найперш маладымі паэтамі, якім ёсць у чым папрактыкавацца ў Васіля Сцяпанавіча.

Пульс часу адчувальны, гістарычная падаплёка непрыхаваная, патрыятычны напал відавочны… Паэзія таксама прысутная. Варта згадаць і не так даўно апублікаваны ў «Літаратурнай Беларусі» яго твор, прысвечаны памяці Васіля Быкава. Гэтыя публікацыі ў незалежнай літаратурнай перыёдыцы гаворыць пра тое, што ў паэта ёсць праблемы з цэнзурай у дзяржаўных літаратурных выданнях, як у сябра «дзяржаўнага» СПБ… Вядома, такое там не надрукуюць:

З нафтавымі
Шчодрымі усплёскамі
Дый гадоўлі нашай валацугамі
Прымяраюць знахары крамлёўскія
Дзеля нас аброць тугую
З цуглямі.
З вышынёй
Паднебнай і бяздоннаю,
Шэпчам мы заклён святы з замовамі –
Толькі б дома нам не быць бяздомнымі,
Толькі б з мовай нам не стаць
Бязмоўнымі!

Вылаўленыя з жыцця і тонка падмастачаныя для літаратуры вясёлыя кароткія зацемы **Уладзіміра Сіўчыкава.** Не ўсяму паверыш, але ўсяму пасміхнешся.

Вершы стала замкнёнага ў сабе паэта, які не заяўляўся раней з публікацыямі, але ўрэшце з'явіўся ў нашай паэзіі ў паважлівым узросце з важкім мастацкім набыткам. Гэта я пра **Валеры Дубоўскага.** Тэмы ў паэта спрадвечныя:

Ці то канчатак мы,
Ці то зачын?
Здалёку мы,
З апошніх далячынь.

Друкуецца дзіўная навэла **Паліны Качатковай** «Люстэркі», застаючыся, як у маім прыватным выпадку, без уражлівых адлюстраванняў прачытанага…

Адметная лірыка **Ганны Аўчыннікавай,** але даволі статычная ў змястоўным плане.

Я прымаю шаленства і грым.
У тэатры падзелены ролі:
Ты ніколі не будзеш маім,
Я тваёю не буду ніколі.

(Нібы ў таго Вазнясенскага: *«Я тебя никогда не увижу. Ты меня никогда не забудешь».)* Аднак у паасобных вершах паэтка самасная і таленавітая (адзін з такіх яе радкоў я скарыстаў для назвы агляду).

Запамінаюцца мудрыя расповеды з афарыстычнымі высновамі ў публікацыі абразкоў **Віктара Сазонава.**

У традыцыйным рэчышчы напісаны вершы **Міколы Кандратава.** Лепшыя з іх вылучаюцца сталасцю думкі і тонкай дакладнасцю вычуванняў, шырокім наборам выяўленчых сродкаў. Але бывае, што*«сядае слова»* — і *«свет без паэтаў псее»*… Гэта паказвае на аўтарскую няўважлівасць пры канчатковым рэдагаванні ўласных тэкстаў. Але ёсць вершы, якія гавораць пра даволі высокі паэтычны патэнцыял аўтара…

Нічога для сябе новага і асаблівага не вычытаў я ў зацемках маладога дэбютанта часопіса **Яўгена Мартыновіча.** Аднак звярнуў увагу на яго творчае жаданне шукаць (і зрэдку знаходзіць) свой стыль і сваю літаратурную форму. Удачы!

А вось дэбют **Кірыла Мяцеліцы** — шматабяцальная заяўка на паэзію. Яго арыгінальнасць і адначасная простасць даюць ёй (паэзіі) правы на жыццё, прынамсі, сучаснае.

Публікуецца палітычна-займальны раман украінскага пісьменніка **Віктара Баранава** ў перакладзе Валерыя Стралко. Твор з усімі сучаснымі праявамі лірыкі і агрэсіі, патрыятызму і цынізму. Падзеі адбываюцца ва Украіне, але для чытача не было б дзіўным, калі б аўтар перанёс іх дзеянне ў іншыя краіны былога СССР…

Друкуецца вельмі цікавая і нязмушаная (разгорнутая) гутарка **Зінаіды Гімпелевіч** з **Васілём Быкавым,** якая шырэй прыадкрывае характар гэтага вялікага нацыянальнага чалавека і творцы. Асабліва карысным будзе чытанне для маладых літаратараў. Да прыкладу, на цікавае пытанне Гімпелевіч пра магчымы пераход Быкава на расійскую мову пры такім цяжкім стане беларускага грамадства і самой мовы нацыі, каб займець у Расіі шырокага чытача, Васіль Уладзіміравіч адказаў так: *«Я ніколі гэтага не зраблю. Канечне, мая расійская цалкам адпавядае таму, каб на ёй пісаць. Яна палепшылася дзякуючы маёй перакладніцкай практыцы. Але навошта мне гэта рабіць? Дзеля чаго? Я лічыў бы такі «пераход» жахлівай здрадай у адносінах да майго роднага слова і, канечне, у першую чаргу да сябе самога».*

Публікацыя артыкула **Міколы Нікалаева** «Першы японец у Савецкай Беларусі» разгортвае досвед і светапогляд беларусаў на сваю гісторыю — далей на Усход…

Пра ВКЛ і бітву з татарамі ля Сіняй Вады, што ў цяперашняй Украіне, піша **Мікола Ліннік.** Сёлета нашы паўднёвыя браты святкавалі 650-годдзе Вялікай бітвы.

Займальнае эсэ пра старыя рэчы друкуе **Міхась Булавацкі.**

Трошкі разбэрсаныя (несабраныя) урывачныя запісы пра Беласточчыну і «Беларускі трыялог» на радзіме Сакрата Яновіча ў Крынках публікуе мастак і эсэіст з Берліну **Алесь Тарановіч.**

Вядомы крытык **Сяргей Кавалёў** разважае над страчаным праектам пакалення драматургаў, што ядналіся ў «Бум-Бам-Ліце».

Друкуецца суплёт ужо вядомых у інтэрнэт-прасторы рэцэнзій на кнігі шортлістэраў прэміі Гедройца.

Генрых Далідовіч піша пра творчы плён вядомага пісьменніка, паэта і эсэіста Алеся Пашкевіча. Ёсць вельмі трапныя і раней не заўважаныя характарыстыкі і пазнакі, якія варта ведаць чытачам пры знаёмстве з літаратурным набыткам і жыццёвай планідай гэтага адметнага творцы.

Аўтар амаль прачытанага вамі агляду **(Леанід Галубовіч)** разважае над спробай літаратараў Гарадзеншчыны выдаваць свой штогодні альманах «Новы замак», над удачамі і хібамі першага незалежнага «бліна» ды параўнальным аналізам яго з берасцейскім альманахам «Жырандоль».

Завяршае публікацыі рубрыка **«Дзеяпіс»** з кароткімі анатацыямі новых кніжных выданняў.

Што ж, лета выдаецца гарачым. Пры вольным часе ад спёкі няблага схавацца ў заценены месцы з чарговым нумарам «Дзеяслова». Я ўпэўнены, што вычуванне абгаворанага вышэй *«граху»* вас ахалодзіць, а лірычны *«гастарбайтар»* ацверэзіць і не давядзе да дрымоты… Душэўнай гармоніі!

«КНІГАРНЯ ПІСЬМЕННІКА»

АБРАНЕЦ ЛЁСУ,
АБО «БЕГ ПА САМААДЧУВАННІ»

Ходзяць чуткі, што ў найноўшай беларускай паэзіі ёсць два самыя прыгожыя і самыя запамінальныя хлопцы (якія, да ўсяго, яшчэ і лепшыя сябры) — Анатоль Івашчанка і Усевалад Сцебурака.

Хто не верыць — палазьце ў інтэрнэце ў сацыяльных сетках, каб пераканацца ў гэтым. Гаворка вядзецца не толькі пра знешняе, але і ўнутранае. Звернемся да новай кнігі аднаго з вышэй згаданых творцаў — Усевалада Сцебуракі.

Ніхто не мае права жыць
з Паэтам,
кахаць, пакутаваць і раўнаваць яго
не тыя дні, калі б ён дбаў пра гэта,
не той напой, які б ён піў нагбом.

Чытаючы гэтыя радкі, якія належаць аднаму з самых трагічных і экстравагантных паэтаў нашай літаратуры XX стагоддзя — Анатолю Сысу, міжволі пачынаеш шукаць творцаў, што адпавядаюць апісанаму ім вобразу «вольнага мастака», у дні сённяшнім, у стагоддзі XXI-м. І знаходзіш.

Вось, прыкладам, паэт, празаік, блогер Усевалад Сцебурака. Любы літаратурны рэдактар (а, як вядома, у кожнай прафесійнай супольнасці ёсць свае сакрэты і адмысловыя азначэнні толькі «для сваіх»), сказаў бы: «Гэта той выпадак, калі паэт мае талент ад Бога, прычым прыродных здольнасцей настолькі багата, што творца можа нават не азадачвацца працаваць над сабой». Бываюць улюбёнцы лёсу, для якіх лічбы ў вядомым афарызме: «Поспех — гэта 1% таленту і 99% працы», мяняюцца месцамі.

У. Сцебураку шэраг самых розных заняткаў і захапленняў (прыкладам, прафесійны тамада або прыгажун, чыё фота трапляе на першыя палосы газет або глянцавую вокладку часопіса) ніякім чынам не замінае займацца сур'ёзнай паэзіяй. Бо здаровы эгацэнтрызм толькі становіцца адбіваецца на вобразе лірычнага героя ягоных вершаў. А гістарычная адукацыя дапамагае аўтару ўпісацца ў нацыянальны кантэкст.

Узор таму — другая кніга Усевалада, якая нядаўна пабачыла свет у серыі «Кнігарня пісьменніка» Бібліятэкі Саюза беларускіх пісьменнікаў.

І калі творца піша ў вершы «Пакрыўджанай Музе»:

Ты крыўдзісься — я не пішу
табе вершаў,
Хоць, зрэшты, умею.
А ведаеш, я вызнаю цябе першай,
І ў вершах нямею.

Як можна на такое нязмушанае паэтычнае маўленне і тонкі камплімент адначасна і субяседніцы, і самому сабе, пакрыўдзіцца? Харызматычнасць і ўменне быць асобай медыйнай — якасці, якіх многім моцна таленавітым творцам не стае. А ў нашага сённяшняга героя гэтага — з лішкам.

У новую кнігу ўвайшлі вершы (у тым ліку асобныя творы з папярэдняга зборніка «Крушня») і некалькі перакладаў А. Вазнясенскага) і празаічныя зацемкі, напісаныя цягам апошніх гадоў.

І на гэтых 96-ці старонках можна знайсці гарадскія («Здарова, мой горад!») і вясковыя («Восень — бурштын і мёд») пейзажы, філасофскую («Давай падлічым pro et contra») і сацыяльную («Зьмітру Дашкевічу да 31-га дня народзінаў») лірыку, не кажучы ўжо пра вечную тэму кахання або кароткія рыфмаваныя гісторыі з жыцця гараджаніна. І нават аповед пра «пакаленьне last» замест пасляслоўя. І выслоўі-«гемаркі» кшталту «Паміраючы, упэўніцеся, што вашае жыццё скончанае». Тут ёсць калі не ўсё, то многае, што дапаможа нам болей дазнацца пра У. Сцебураку — як пра асобу і як пра паэта.

Распушчаецца цукар у каве,
сіняй хваляю плавае дым.
І аднолькавы прысмак гаркавы —
і ў душы, і ў кубку маім.

І паколваюць дробязі лёсу —
крошкі хлебныя на прасьціне,
і падносіць ізноў папяросу
цень да вуснаў на гладкай сьцяне.

І вісіць верасьнёўская поўня
ціхім шыбеньнікам нябёс.
Я б пакутную зьняў, ды няроўня —
не дарос.

На вокладцы кнігі «Бег па самаадчуванні» — чырвоная мішэнь. Ці пацэліць Усевалад Сцебурака ў чытацкія сэрцы? Паглядзім. Але ў самы яблычак паэзіі відавочна патрапіў.

Віка Трэнас

ВЫСАКАРОДНЫ РЫЦАР НАЙНОЎШАЙ ПАЭЗІІ

Хто сказаў, што ў Беларусі няма сапраўдных мужчын — галантных, адукаваных і высокаінтэлектуальных? Магчыма, часы рыцарства і засталіся ў Сярэднявеччы, дый і джэнтльменства, можа, не ў модзе сучасных маладзёнаў.

Але ў беларускай паэзіі пакалення трыццацігадовых высакародны рыцар, сімпатычны ва ўсіх адносінах, дакладна ёсць — Анатоль Івашчанка.

(Рэмарка: дзяўчаты, не спакушайцеся — Прыўкрасная Дама ў нашага творцы, як і трое цудоўных дзетак, ужо маюцца. Аднак ніхто не замінае чытачам і чытачкам адчуць смак паэзіі, надрукаванай у новай кнізе Анатоля, што выйшла ў серыі «Кнігарня пісьменніка» Бібліятэкі Саюза беларускіх пісьменнікаў.)

«Хай так» — так называецца другі паэтычны зборнік спадара Івашчанкі, куды ўвайшлі вершы, напісаныя цягам апошніх сямі гадоў. І творы ў выданні падзеленыя на сем раздзелаў. Выпадковасць ці вера ў магію лічбаў? Варта было б запытацца ў аўтара.

Творы ў рыфму і верлібры, каверы і пераклады, шэраг прысвячэнняў калегам-сябрам-сучаснікам і нават «незавершаныя вершы» (недапісанае, але вартае апублікавання) — многае ўвайшло ў гэтую кнігу. Ад кранальных паэтычных аповедаў пра дарагіх і блізкіх аўтару людзей — да тваё ўвострасацыяльнай тэматыкі. Кожны знойдзе тут нешта адметнае для сябе.

***

кнігу, што дасталася
ў спадчыну,
паклаў у кішэнь
гаспадар яе даўно спачыў
ён руплівa збіраў сваю вялізную
бібліятэку
недарма?..

Віка Трэнас

«У НОЧЫ — СВАЯ ЛОГІКА»

Віктар Марціновіч з яго раманам «Сфагнум» (серыя «Кнігарня пісьменніка» Бібліятэкі Саюза беларускіх пісьменнікаў) працягвае традыцыі Яна Баршчэўскага і Юрыя Станкевіча.

Ён даўно, ужо каторы год, прыглядаецца да міфаў і архетыпаў як сродкаў вытлумачэння ірацыянальнай рэальнасці цяперашняй Беларусі. Гэта відаць з яго публіцыстыкі, дзе інгрэдыенты — з аднаго боку, міфалогія, з другога — кавалкі заходняга сацыялагічна-філасофскага мыслення.

Раман «Сфагнум» (сфагнум — мох без каранёў, насення, кветак, пладоў) таксама напісаны праз гэтую, абраную аўтарам як вытлумачальны інструмент, прызму.

Раман злучае такіх, здавалася б, розных і разначасавых беларускіх пісьменнікаў, як Ян Баршчэўскі («Шляхціц Завальня») ды Юры Станкевіч («Любіць ноч — права пацукоў»). І гэтым замацоўвае тэндэнцыю, якую можна назваць тыпова беларускай, тутэйшай.

Чаму Баршчэўскі і Станкевіч, а не Іван Мележ з яго «Людзьмі на балоце»? Мележ — «меліяратар». А, як паказала практыка, трохі балатоў мо' і асушылі, дык балаты сышлі яшчэ глыбей. Глыбей — у душы, дзе меліяраваць не так лёгка. А Баршчэўскі і Станкевіч у тых балотах шчыруюць.

В. Марціновіч (следам, дарэчы, за літаратуразнаўцам Пятром Васючэнкам з яго «вокам тайфуна»), адлюстроўваючы рэальнасць публіцыстычна і потым рэзюмуючы яе ж пamастацку, кажа: вы думалі, яно ўсё знікла? балота цяпер у нас, яно жывое, мы носім у сабе «сфагнум — душу балота»; тысячагадовая меліярацыя лязнула як праект; балота — гэта тое, што не вытлумачыш, гэта метафара невытлумачальнасці душы; нарэшце, «у ночы — свая логіка».

Ян Баршчэўскі яшчэ ў XIX стагоддзі паказваў дакладна такія ж карцінкі:

«Тамаш падышоў да гаспадара, і калі той глядзеў на яго як непрытомны, пачаў казаць чарадзейныя словы. І тут можна было ўбачыць яшчэ страшнейшае відовішча: з усіх адтулін з галавы пана суддзі вылязалі пухіры накшталт мыльных бурбалак і, лопаючыся пад столлю, перамяніліся ў жахлівых пачвараў — тут і крылатыя гадзюкі, і цмокі, і іншая брыдота, падобная да спарахнелых шкілетаў. Усё гэтае страхоцце лётала над галовамі, на падлогу падалі косці і галовы нябожчыкаў. Ад жаху ўсе самі нагадвалі трупаў, што паўставалі з магіл. Нарэшце Тамаш махнуў рукою: усе тыя гадзюкі, цмокі і шкілеты зніклі — і ён сам выйшаў за дзверы, пакінуўшы гаспадара і гасцей анямелымі ад страху».

Аблічча «тыпова беларускай тэндэнцыі» ў літаратуры (і літаратуразнаўстве ж таксама), такое: ёсць бяспечны цэнтр (амаль Axis Mundi), у ім чалавек, навокал канцэнтрычна, як на вадзе, разыходзяцца колы хаосу, там ёсць жыццёвая «мана», па яе трэба туды ныраць і прыносіць.

У Баршчэўскага з цэнтра, з хаты, дзе сядзіць апавядальнік, людзі разыходзяцца ў думках, слухаючы аповеды. У Станкевіча (у якога і балота — сімвалічнае) той цэнтр разгайданы, але найчасцей месціцца ў самым чалавеку (такая спецыфіка аўтара — наяўнасць самотніка героя), які змяшчае цэнтр там, дзе знаходзіцца сам.

Дзе ў Баршчэўскага цэнтр па гэты бок (езуцкая адукацыя), дзе ў Станкевіча цэнтр перасоўны — там у Марціновіча цэнтраў два.

Хата ў паўжылой вёсцы Буда Глускага раёна — і выспа з дубам на камянях пасярод балота на трацціну Глускага раёна.

І абодва яны функцыянуюць як мае быць! Хата стаіць пасярод «мінска-маскоўскага» хаосу, выспа — пасярод магічнага хаосу. І туды, і туды людзі едзяць па нешта важнае, хоць і рознае.

Можна яшчэ дадаць, што ў Марціновіча галоўны герой — Шульга — усё ж больш «станкевіцкі». Праз яго набываюць абрысы важныя «ідэалагічныя» рэчы (ён распавядае пра традыцыі замыкання хатаў, ён тлумачыць матывацыю вяскоўцаў, ён праяўляе не выпадковыя здольнасці ў ключавых «магічных» сітуацыях). Хоць менавіта наяўнасць гэтага героя, Шульгі, і зніжае даставернасць рамана «Сфагнум» да працэнтаў 70-80-і.

Бо ўсё іншае ёсць, тут маем — а пра такіх герояў не чулі. Але менавіта такі герой і злучае ўсю фрагментаваную рэальнасць (мянты, скарбы, балота, маскава, чужынцы, савок, чараўнікі) у адзіны наратыў, фактычна ствараe канву рамана. І гэты момант не можа не быць адзначаны: без такога героя ўсё гэта працягне заставацца фрагментаваным.

Такі герой — і ёсць той Сфагнум. Бадзяжнік-трыкстар з памяццю. Ён і ёсць душа балота і яго цэнтр. Кацігарошак беларускіх казак.

Алесь Мікус

ЛІТКАЛЕЙДАСКОП

САМЫЯ-САМЫЯ...

Рассыпны набор з драўляных літар быў вядомы ў Індыі яшчэ за шмат стагоддзяў да Гутэнберга. А гліняныя літары ўжываліся ў Кітаі яшчэ ў XIII стагоддзі.

* * *

Самая вялікая ў свеце кніга знаходзіцца ў адным з музеяў Амстэрдама. Яна называецца «Збор марскіх правілаў». Вышыня кнігі больш сярэдняга чалавека, шырыня — 1 метр, таўшчыня — каля паўметра.

* * *

Самай цяжкай у свеце кнігай лічыцца геаграфічны атлас, які захоўваецца ў Брытанскім музеі ў Лондане. Атлас мае ў вышыню больш аднаго метра і важыць 320 кілаграмаў.

* * *

Адна з самых незвычайных у свеце кніг — гэта «Боская камедыя» Дантэ, напісаная на лісце паперы памерам 80 на 60 см бенедыктынскім манахам Габрыэлем Чэлані. Усе 14000 вершаў можна лёгка прачытаць няўзброеным вокам, а калі паглядзець на ліст з адлегласці, то бачыш маляўнічую карту Італіі. На гэтую працу Чылані патрацій чатыры гады.

* * *

Дванаццаць самых маленькіх кніг свету змяшчаюцца ў… адной сталовай лыжцы. Сярод іх ёсць мініяцюрнае выданне Карана, слоўнік ангельскай мовы на 12 тысяч слоў і Канстытуцыя Францыі.

* * *

Самай дарагой кнігай на свеце ў наш час лічаць унікальны «Апакаліпсіс», выдадзены французам Жозэфам Форы. Гэтая кніга ацэнена ў 100 мільёнаў «старых» франкаў. Яна выстаўлена ў Музеі сучаснага мастацтва ў Парыжы.

* * *

Італьянец Рыа Казэллі збірае сусветную калекцыю самых сумных кніг. У ёй каля 10 тысяч тамоў. Адзін італьянскі паэт-няўдачнік, даведаўшыся, што ўсе яго зборнікі знаходзяцца ў Казэллі, ледзь не стаў самагубцам.

* * *

«Адзіныя і найглыбокія сакрэты медыцынскага мастацтва» — такую назву мела тоўстая, у 100 старонак, кніга, знойдзеная запячатанай сярод рэчаў славутага галандскага доктара Германа Бурхавэ пасля яго смерці ў 1738 годзе. Кніга была прададзена на аўкцыёне за 10 тысяч даляраў золатам. Пасля таго, як пячатка была зламана, выявілася, што старонкі не былі… чыстымі. Толькі на тытульным лісце меўся надпіс: «Трымай галаву ў холадзе, ногі ў цяпле, і ты зробіш бедняком лепшага лекара».

МАЛА ХТО ВЕДАЕ...

Мала хто ведае, што Адам Міцкевіч быў не толькі паэтам, але і празаікам-фантастам. І зазірнуў і ў наш «тэлекасмічны» час. У рамане «Гісторыя будучыні» ён пісаў пра акустычныя прыборы, з дапамогай якіх, седзячы ля каміна, можна слухаць канцэрты з далёкага горада, а таксама пра механізмы, якія дапамагаюць насельнікам Зямлі падтрымліваць сувязь з істотамі, якія насяляюць іншыя планеты…

* * *

Бальзак, пачынаючы працаваць над новым творам, замыкаўся ў пакоі на адзін-два месяцы і шчыльна зачыняў аканіцы, каб праз іх не праходзіла святло. Пісаў ён пад свечкамі, апрануты ў халат, па 18 гадзінаў штодня!

* * *

Несправядлівая лёс здаўна ставіўся да многіх пісьменнікаў. Сярод іх — ангельскі празаік XVI–XVII стагоддзяў Джон Стоў, які на схіле гадоў патрапіў у страшную галечу. Ангельскі ўрад выдаў адмысловы ўказ, які абвяшчаў: «З прычыны таго, што Стоў патраціў сорак пяць гадоў на збіранне матэрыялаў для гісторыі Англіі і дванаццаць на апісанне гарадоў Лондана і Вестмінстара, мы даём яму наш міласцівы і каралеўскі дазвол прасіць літасціню ў нашых паддадных».

* * *



Жуль Верн марнаваў шмат гадзінаў у дзень на вывучэнне навуковай літаратуры, выпісваючы цікавыя для яго факты на адмысловыя карткі. У яго картатэцы было больш за 20 тысячаў такіх запісаў. А што б ён рабіў у нашую эпоху інтэрнэту?

* * *

У «Рабінзона Крузэ» ёсць працяг. У ім Рабінзон ізноў трапляе ў караблекрушэнне і змушаны дабірацца ў Еўропу праз усю Расію. Восем месяцаў ён, зімой, жыве і чакае цяпла ў Табольску. У Расіі гэты раман не выдаваўся з 1935 года. Асцерагаліся алюзій на сталінскія лагеры?

* * *

Стваральніца знакамітага рамана «Авадзень» Этэль Лілiян Войніч была і кампазітарам, а свае музычныя творы лічыла больш значнымі, чым літаратурныя.

* * *



Жан Жак Русо быў аўтарам музычнага слоўніка і напісаў камічную оперу «Вясковы вядзьмак», якая стала родапачынальніцай французскіх опервадэвіляў і якая пратрымалася на французскай опернай сцэне больш за 60 гадоў.

* * *

Вальтэр адначасова пісаў некалькі твораў. Сядаючы да працоўнага стала, ён, у залежнасці ад настрою, браў рукапіс і працягваў над ім працаваць.

Старонка падрыхтавана паводле матэрыялаў Newsru.ua, novostiliteratury.ru, РИА Новости і Deutsche Welle.

КНІГАТЭРАПІЯ

КНІГІ — ЛЕКІ СУПРАЦЬ СТРЭСУ

Спецыялісты з Оксфарда высветлілі, што чытанне з'яўляецца лепшым спосабам пазбавіцца ад стрэсавага стану.

У выніку шматлікіх даследаў навукоўцы-медыкі прыйшлі да высновы, што менавіта чытанне аказвае самы хуткі эфект на арганізм, апярэджваючы дзеянне лёгкага шпацыру, праслухоўвання любімай музыкі, чаявання ці нават прыёму алкагольных напояў.

Добраахвотнікам, якія прынялі ўдзел у навуковым даследаванні, давялося выконваць розныя практыкаванні, здольныя выклікаць у іх стрэс. А вось метады рэлаксацыі ўдзельнікі эксперыменту выбіралі самі.

Як паказала магнітна-рэзананснае даследаванне, у галаўным мозгу людзей, якія чыталі пра водары, смачныя стравы ці маляўнічыя ландшафты, пачыналі актывізавацца ўчасткі, адказныя за ўспрыманне. Прычым практычна гэтак жа, як і ў рэальнасці. Падчас кампутарных гульняў ці прагляду тэлевізара падобнага эфекту спецыялісты не назіралі.

Пры чытанні ўзровень стрэсу змяншаўся ў сярэднім на 68%, праз шэсць хвілінаў пасабляліся цяглі-цы і стабілізавалася сэрцабіццё.

Праслухоўванне музычных кампазіцый супакойвала ў 61% выпадкаў. Ужыванне гарбаты ці кавы змяншала стрэс у 54% удзельнікаў, а шпацыр — у 42%.

Эксперты таксама адзначылі, што выбар літаратурнага жанру ніяк не ўплывае на эфектыўнасць чытання. Усё, што неабходна для пераадолення наступстваў перажытага стрэсу, — зразумець сюжэт апавядання і цалкам у яго «пагрузіцца».

НЯМЕЦКІЯ БІБЛІЯТЭКІ ДЛЯ СЛЯПЫХ

Бібліятэкі для сляпых у Нямеччыне прапануюць чытачам аўдыёкнігі на CD, запісаныя ў адмысловым DAISY-фармаце.

Іх прайграваюць і звычайныя MP3-плэеры, аднак усё ж зручней карыстацца DAISY-плэерамі, якія распазнаюць у файлах шматузроўневую навігацыю і маюць магчымасць выбару: агучванне аўдыёкнігі дыктарам ці праграмным маўленчым сінтэзатарам.

Каб запісацца ў бібліятэку, жыхару Нямеччыны досыць падаць адміністрацыі пасведчанне сляпога або медыцынскую даведку пра немагчымасць чытаць стандартныя друкаваныя выданні, а таксама аплаціць аднакратны рэгістрацыйны збор (сума складае 30–50 еўра, дзяржава выдае кожнаму грамадзяніну ФРГ, які слаба бачыць, штомесячную дапамогу ў памеры 567 еўра).

Кнігі з бібліятэкі заказваюцца па аўдыякаталогу, які рассылаецца на CD; афарміць замову можна па тэлефоне, e-mail ці на афіцыйных сайтах. Пасля гэтага бібліятэка адпраўляе кнігі па пошце (таксама на CD), і праз 4–6 тыдняў чытач павінен іх вярнуць. Бібліятэчны фонд падобных устаноў досыць шырокі — так, у Баварскай бібліятэцы для людзей з аслабленым зрокам захоўваецца каля 8000 твораў, а ў цэлым каталог DAISY-запісаў аўдыёкніг, складзены з фондаў бібліятэк Нямеччыны, Швейцарыі і Аўстрыі, уключае 30000 розных файлаў. Паказальна, што калі кнігі, якую замовіў чытач, няма ў бібліятэцы, у якой ён зарэгістраваны, аўдыёзапіс могуць даслаць з іншага фонду. Дарэчы, начытка аўдыёкніг вядзецца пераважна супрацоўнікамі бібліятэк; так, Баварская бібліятэка мае 3 студыі, у якіх працуе каля 20 чытальнікаў.

ПРЭМІІ

ДЗЯРЖПРЭМІЯ РАСІІ – ВАЛЯНЦІНУ РАСПУЦІНУ

З фармуліроўкай «за выбітныя дасягненні ў галіне гуманітарнай дзейнасці» дзяржпрэмія РФ у 2013 годзе была прысуджана пісьменніку Валянціну Распуціну. Дарадца кіраўніка Расіі па культуры Уладзімір Талстой, называючы імёны лаўрэатаў, адзначыў, што «гуманітарныя дасягненні» маюць на ўвазе не толькі мастацкія, але і «агульнаграмадзянскія» заслугі. Празаік В. Распуцін узначальвае расійскі рух за зберажэнне ў першасным выглядзе возера Байкал.

Дзяржаўная прэмія Расійскай Федэрацыі — персанальная. Ёй ганаруецца толькі адзін спашукальнік.

НАЙБУЙНЕЙШАЯ НЯМЕЦКАЯ ПРЭМІЯ

Акадэмія нямецкай мовы і літаратуры абвясціла імя лаўрэата прэміі імя Георга Бюхнэра за 2013 год.

Узнагароду атрымала пісьменніца Сібіл Левічараў. Яе раманы адрозніваюцца «невычэрпнай энергіяй, магутным апавядальным уяўленнем і моўным багаццем», — падкрэслівае журы прэміі, якая ўручаецца штогод Акадэміяй нямецкай мовы і літаратуры ў Дармштаце.

Сібіл Левічараў нарадзілася ў 1954 годзе ў Штутгарце ў сям'і балгарына і немкі, аўтар сямі раманаў і некалькіх зборнікаў эсэ.

Грашовы памер гэтай самай прэстыжнай нямецкай літаратурнай прэміі, што носіць імя паэта і драматурга Георга Бюхнэра, складае 50 тысячаў еўра. Узнагароду ўручаюць з 1951 года. Яе лаўрэатамі былі Гюнтэр Грас, Генрых Бёль, Эльфрыда Элінэк, якія пазней атрымалі Нобелеўскую прэмію.

РАЗЬБА ПА КНІГАХ

Выразаць можна і… на кнігах.



Мастацтва бук-карвінга, ці мастацкае выразанне па кнігах, некаторыя лічаць варварствам, — але некаторыя прыклады ўражваюць і матывуюць! Як, напрыклад, гэты замежны «эскіз», які заклікае марыць заўсёды і які… нагадвае выяву Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі…

БІБЛІЯТЭКІ — БЕЗ КНІГ?

Букрыдэры (чытары) заменяць у бібліятэках кнігі?

У Сан-Антоніа (ЗША, штат Тэхас) увосень 2013 года з'явіцца першая ў свеце бібліятэка, у якой не будзе кнігасховішча ў класічным разуменні гэтага слова. BiblioTech — праект публічнай бібліятэкі, у якой традыцыйныя папяровыя кнігі цалкам заменяць іх электронныя варыянты.

Ініцыятыва стварэння «бібліятэкі без кніг» належыць мясцоваму суддзю Нэльсану Вульфу. На распрацоўку праекта BiblioTech яго падштурхнула біяграфія эксікіраўніка карпарацыі «Apple» Стыва Джобса аўтарства Ўолтара Ісааксана, былога старшыні тэлекампаніі «CNN» і рэдактара штотыднёвіка «The Time».

Мяркуецца, што на пачатковым этапе ў бібліятэцы будзе даступна 100 букрыдэраў для чытання электронных кніг, якімі можна не толькі карыстацца ў чытальнай зале, але і браць напракат на вызначаны тэрмін. У BiblioTech можна будзе прыйсці і са сваім букрыдэрам, каб загрузіць у яго ўпадабаную кнігу.

Кіраўнік праекта «ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» Алесь ПАШКЕВІЧ. Рэдактар Барыс САЧАНКА. Тэлефон для даведак: (8-017) 200-80-91.
Адрас электроннай пошты: sbp@tut.by